# МАСТАЦТВА

## (АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА)

6



# МАСТАЦТВА

## (АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА)

Вучэбны дапаможнік для **6** класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

*2-е выданне, перагледжанае*

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2023

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

УДК 7.03(100)(075.3=161.3)
ББК 85(0)я721
М86

Аўтары: Ю. Ю. Захарына, С. І. Колбышава, Н. С. Валанцэвіч, В. А. Грачова, М. А. Волк, А. А. Маруноў.

Пераклад з рускай *А. У. Бельскай*

Рэцэнзенты: кафедра музычнай педагогікі, гісторыі і тэорыі выканальніцкага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» (кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт *І. Ю. Аношка*); настаўнік вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 5 г. Магілёва» *С. У. Панкрацьева*

Матэрыялы электроннага дадатку размешчаны на рэсурсе https://e-vedy2.adu.by.

**ISBN 978-985-599-529-7**

© Бельская А. У., пераклад на беларускую мову, 2023
© Афармленне. РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2016
© Афармленне. РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2023, са зменамі

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

# Змест

**Уводзіны** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
§ 1. «Вечныя» тэмы ў мастацтве . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6

**Раздзел 1.** Як уладкавана мастацтва? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
§ 2. Віды і жанры мастацтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
§ 3. Вучымся разумець выяўленчае мастацтва . . . . . 16
§ 4. Вучымся разумець архітэктуру, музычнае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва . . . . . . . . . . . . . . . 20
§ 5. Вобраз Творцы ў мастацтве . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22

**Раздзел 2.** Дыялогі ў мастацтве . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
§ 6. Дыялог мастацтваў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
§ 7. Садружнасць мастацтваў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
§ 8. Сінтэз мастацтваў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
§ 9. Творчы ўрок: малюем музыку . . . . . . . . . . . . . . . . 39

**Раздзел 3.** Свята ў жыцці людзей . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
§ 10. Святы ў розных культурах свету . . . . . . . . . . . . . 42
§ 11. Таінства народных свят . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47

**Раздзел 4.** Тэатр бачны і нябачны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
§ 12. Паходжанне тэатра . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
§ 13–15. Вучымся разумець тэатральнае мастацтва . . . 57
§ 16. Творчы ўрок: «ажылыя карціны» . . . . . . . . . . . . . 62
§ 17. Як уладкаваны сучасны тэатр? . . . . . . . . . . . . . . 64
§ 18. Тэатр лялек . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
§ 19. Музычны тэатр: опера і балет . . . . . . . . . . . . . . . 73

**Раздзел 5.** Кіно — дзясятая муза . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
§ 20. Паходжанне кінамастацтва . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
§ 21–22. Гульнявое (мастацкае) кіно . . . . . . . . . . . . . . . 82
§ 23–24. Вучымся разумець кіно . . . . . . . . . . . . . . . . . . 87
§ 25. Анімацыйнае кіно . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
§ 26. Анімацыйнае кіно беларускіх майстроў . . . . . . . . 96
§ 27. Творчы ўрок: сам сабе рэжысёр . . . . . . . . . . . . . 99

**Раздзел 6.** Мастацтва «на кончыках пальцаў» . . . . . . . . . . . . . . . 101
§ 28–29. Фатаграфія як від мастацтва . . . . . . . . . . . . . 102
§ 30–31. Тэлебачанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
§ 32–33. Камп’ютарнае мастацтва . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
§ 34. Творчы ўрок: мастацтва і тэхніка . . . . . . . . . . . . 117
§ 35. Творчы праект . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

# ЯК ПРАЦАВАЦЬ З ПАДРУЧНІКАМ

Дарагія дзеці! Вучэбны дапаможнік, які вы трымаеце ў руках, дазволіць вам акунуцца ў новыя віды мастацтва — цырк, тэатр і кіно. Вы пабываеце на сцэне тэатра оперы і балета, на здымачнай пляцоўцы, пазнаёміцеся з вядомымі рэжысёрамі і артыстамі, даведаецеся пра камп’ютарнае мастацтва.

У працы вам дапаможа электронны дадатак, які змяшчае творы мастацтва, фрагменты тэатральных спектакляў і кінафільмаў. Адкрыць яго вы зможаце праз QR-код. Адсылка да электроннага дадатку пададзена значком .

У вучэбным дапаможніку пасля кожнага параграфа прадугледжаны «Пытанні і заданні», адказаўшы на якія, вы ўбачыце ўжо знаёмыя вам мастацкія творы з новага боку. У «Творчай майстэрні» атрымаеце асабісты досвед стварэння новага твора мастацтва. Вы даведаецеся пра тое, як і з дапамогай якіх матэрыялаў і тэхнік нараджаецца мастацкі твор.

Вы знойдзеце азначэнні новых слоў, з якімі сустрэнецеся на ўроках мастацтва, пазнаёміцеся з яркімі прыкладамі твораў розных відаў мастацтва. Лепш зразумець матэрыял вам дапамогуць наглядныя схемы. Кожны параграф вучэбнага дапаможніка заканчваецца вывадам, які выдзелены колерам. Прачытайце яго некалькі разоў асабліва ўважліва!

Часам вам можа спатрэбіцца дадатковая інфармацыя, якую неабходна знайсці самастойна. Адсылка да інфармацыйных крыніц — даведачнай літаратуры, энцыклапедый, іншых інтэрнэтрэсурсаў — пададзена значком .



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

АРХІТЭКТУРА, СКУЛЬПТУРА, ЖЫВАПІС, МУЗЫКА І ПАЭЗІЯ СПРАВЯДЛІВА МОГУЦЬ БЫЦЬ НАЗВАНЫ СВЯТЛОМ ЖЫЦЦЯ.

*Ге́рберт Спе́нсер*

# УВОДЗІНЫ



**Вінцэ́нт Ван Гог.** Зорная ноч

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Мастацтва суправаджае чалавека ўсё жыццё. Ад калыханак, пачутых упершыню з вуснаў маці, — да найвялікшых твораў дойлідаў, скульптараў, жывапісцаў…

Кожная новая сустрэча з мастацтвам нараджае новыя эмоцыі, стварае новы настрой. Адны творы мастацтва супакойваюць ці зачароўваюць. Другія — надаюць мужнасці, рашучасці. Трэція — выклікаюць радасць і задавальненне.

Для кагосьці мастацтва — захапленне, а для кагосьці — магчымасць адкрыць таямнічыя старонкі гісторыі ці нават прафесія! Але для кожнага чалавека мастацтва — гэта спосаб спазнаваць свет і самога сябе.

## § 1. «ВЕЧНЫЯ» ТЭМЫ Ў МАСТАЦТВЕ

Мастацтва — нязменны спадарожнік чалавека. Але калі яно з'явілася? Што лічыць першымі творамі мастацкай культуры? Як адрозніць мастацтва ад таго, што мастацтвам не з'яўляецца? Да цяперашняга часу на гэтыя пытанні няма адназначнага адказу.

Навукоўцы з усяго свету — мастацтвазнаўцы, археолагі, гісторыкі — выказваюць мноства здагадак і тэорый пра першаасновы мастацтва. Але ўсе яны падобныя ў адным. Мастацтва з'явілася тады, калі чалавек пачаў усведамляць прыгажосць свету і імкнуцца прыўнесці яе ў сваё жыццё.



Наскальны малюнак з пячоры Пеш-Мерль (Францыя)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Сфінкс і піраміда Хео́пса (Егіпет)



Замак Гагенцо́лерн (Германія)

З першабытных часоў чалавек імкнуўся ўпрыгожваць месца, у якім жыў. Так, на сценах і скляпеннях пячор захаваліся сляды чалавечых далоняў, хвалістыя лініі, геаметрычныя фігуры, выявы жывёл. Менавіта ў тыя далёкія часы і нараджалася мастацтва.

Мастак заўсёды імкнецца выказаць у творах *свой* погляд на свет. Нягледзячы на тое што мастацкія каштоўнасці пастаянна змяняюцца, асобныя тэмы і вобразы па-ранейшаму застаюцца запатрабаванымі.

***Тэма гісторыі***. Мастацтва кантактуе з чалавекам праз час. Пахавальні фараонаў, каралеўскія палацы дораць нам свае шматвяковыя скарбы. Адкрываючы іх, мы разгадваем таямніцы мастацкага майстэрства, знаёмімся з дасягненнямі чалавека ў розных сферах дзейнасці. Таму тэма гісторыі ў мастацкай культуры заўсёды была асабліва значнай.

У творах розных відаў мастацтва аўтары імкнуцца паказаць найбольш важныя моманты ў жыцці грамадства, з якіх складаецца гісторыя цывілізацый, дзяржаў, нацый. Дзякуючы мастацтву мы даведваемся, як узводзіліся грандыёзныя грабніцы, непрыступныя замкі, велічныя саборы, як вяліся бітвы, як мянялася мода... Мы даведваемся, як мяняўся чалавек — гасудар, военачальнік, дваранін, памешчык, селянін, рабочы.

***Бытавая тэма.*** Вялікую значнасць маюць і карціны на бытавую тэму. У іх майстры мастацтва адлюстроўваюць непаўторныя імгненні з жыцця людзей розных краін і эпох.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



**Юдаль Пэн.**
Вуліца ў Віцебску

На карціне «Вуліца ў Віцебску» Ю́даля Пэ́на адкрываецца від на адзін з куткоў роднага горада беларускага мастака. Вуліца, забудаваная шматкватэрнымі дамамі, не пустэльная. Асветленая яркім сонцам, яна напоўнена жыццём. Паўсюль — людзі, занятыя штодзённымі справамі.

Яркія, сакавітыя фарбы лета перадаюць радасны настрой дзвюх дзяўчат на карціне «Сяброўкі» беларускай мастачкі Раісы Кудрэ́віч. З хваляваннем і любоўю мастачка адлюстравала звычайную сцэну — сустрэчу сябровак і іх размову пра патаемнае. Адна дзяўчына чытае ліст. Яе сяброўка проста марыць. Ззянне жаночага шчасця напаўняе кампазіцыю цяплом і святлом.



**Раіса Кудрэвіч.**
Сяброўкі

***Тэма прыроды.*** Ва ўсе часы мастакі любілі звяртацца да тэмы прыроды. Незвычайна



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

прыгожыя краявіды розных куткоў свету адкрываюць нам пейзажы, музычныя і паэтычныя замалёўкі.

На палатне «Ручай у лесе (На касагоры)» рускі мастак Іван Шышкін намаляваў пагодны дзень. Шматгадовыя елкі і хвоі з гонкімі ствaламі цягнуцца да сонца. Зялёная трава і мох, нібы коўдра, ахутваюць лясныя ўзгоркі, ля падножжа якіх цурчыць ручай. У яго крыштaлёва чыстай вадзе адлюстроўваюцца прабліскі неба, якія праступаюць скрозь ігліцу дрэў. Сонечнае святло азарае ўзлесак дзесьці ўдалечыні, прапануючы гледачу паблукаць па лесе, атрымаць асалоду ад гучання прыроды.



**Іван Шышкін.**
Ручай у лесе (На касагоры)

***Тэма чалавека.*** І ўсё ж цэнтральным вобразам мастацкіх твораў быў і застаецца чалавек — яго аблічча, унутраны свет, учынкі. Чалавек паўстае перад намі ў выглядзе то заспакоенай прыгажуні, то адважнага рыцара, то задуменнага героя.

На карціне «Мадонна са шчыглом» італьянскі мастак Рафаэ́ль стварыў вобраз ласкавай клапатлівай маці, якая з любоўю назірае за тым, як дзіця Іаан Хрысціцель перадае Хрысту птушаня. Вобраз



**Рафаэль.**
Мадонна са шчыглом



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Божай Маці сугучны навакольнаму пейзажу, яе позірк адухоўлены і паэтычны.

У мініяцюры «Танец Аніт́ры» з музыкі да драмы «Пер Гюнт» кампазітара Эдварда Грыга мы знаёмімся з Анітрай — дзяўчынай з арабскага племя. Лёгкае, амаль празрыстае гучанне струнных інструментаў стварае грацыёзны, чароўны вобраз усходняй прыгажуні. Мы чуем, як іграюць каштоўныя камяні ў яе ўборы, адчуваем спёку Аравійскай пустыні. Такім чынам музыка здольная аб'ядноўваць у сабе многія тэмы мастацтва — чалавека, гісторыі, прыроды.

Мастацтву падуладныя любыя тэмы і сюжэты. Разам з тым на працягу многіх стагоддзяў застаюцца нязменна важнымі тэмы гісторыі, прыроды, чалавека... Такія тэмы ў мастацтве называюць вечнымі.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія тэмы ў мастацтве называюць вечнымі? Праілюструйце свой адказ мастацкімі творамі, з якімі вы пазнаёміліся на ўроках мастацтва ў пятым класе.

2. Падумайце, да якой тэмы мастацтва можна аднесці карціну «Зорная ноч» Вінцэнта ван Гога.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Назавіце свой любімы мастацкі твор. Чаму вы яго выбралі? Якой тэме мастацтва ён адпавядае? Падбярыце на старонках вучэбнага дапаможніка і ў электронным дадатку некалькі твораў, якія адпавядаюць гэтай жа тэме. Якое ўражанне на вас зрабіў кожны з іх?



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Раздзел 1

...АДЗІНАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ — ГЭТА ПРАЎДА, ЯКАЯ РОБІЦЦА БАЧНАЙ.

*Агю́ст Радэ́н*

# ЯК УЛАДКАВАНА МАСТАЦТВА?



**Зура́б Цэрэтэ́лі.** Вялікія майстры. Адлюстраваны (злева направа): Марк Шага́л, Анры́ Маці́с, Амедэ́а Мадылья́ні, Па́бла Піка́са, Вінцэ́нт Ван Гог (г. Масква, Расія)

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Свет мастацтва дзівосны і разнастайны. Ён расказвае нам пра яркія падзеі ў жыцці грамадства, пра тое, як раслі гарады, змяняліся ўяўленні чалавека аб прыгажосці, узбагачаліся веды пра ўладкаванне Сусвету, здзяйсняліся навуковыя адкрыцці.

Сустракаючыся з творам мастацтва, мы эмацыянальна ацэньваем яго — прыгожы ён ці брыдкі, выклікае захапленне ці абыякавасць. Тым не менш зразумець глыбінны сэнс мастацкага твора, ацаніць у ім усё, што на першы погляд здавалася незаўважным і непрывабным, можа толькі той, хто валодае ведамі і вопытам зносін з мастацтвам.

## § 2. ВІДЫ І ЖАНРЫ МАСТАЦТВА

У мастацкіх творах перад намі паўстаюць непаўторныя вобразы, пануе незвычайная атмасфера. Мастакі адлюстроўваюць тое, што адбываецца ў рэальным свеце, і тое, чаго не можа быць у сапраўднасці.

**Мастацтва** — спосаб, форма і вынік адлюстравання і пераўтварэння рэчаіснасці ў мастацкіх вобразах.

**Від мастацтва** — своеасаблівая форма творчай дзейнасці, у якой аўтар увасабляе сваю ідэю.

Твор мастацтва — гэта вынік мастацкай творчасці чалавека. Кожны твор адносіцца да пэўнага *віду мастацтва*.

Кожны від мастацтва мае свае асаблівасці. Галоўныя з іх заключаюцца ў тым, *як*, *якім спосабам* перададзены мастацкі вобраз. А таксама ў тым, *як гэты вобраз існуе ў прасторы і часе*.

***Прасторавыя віды мастацтва***. Да прасторавых відаў мастацтва адносяць *архітэктуру*,



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

| Віды мастацтва | | |
|---|---|---|
| **Прасторавыя:** | **Часавыя:** | **Прасторава-часавыя:** |
| • архітэктура;<br>• выяўленчае мастацтва;<br>• дэкаратыўна-прыкладное мастацтва | • музыка;<br>• літаратура | • танец;<br>• тэатр;<br>• цырк;<br>• кіно |

*выяўленчае*, *дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*. Гэтыя віды мастацтва таксама называюць *пластычнымі*, паколькі мастацкія вобразы перадаюцца ў аб'ёме, гэта значыць маюць тры вымярэнні — вышыню, шырыню і глыбіню. А прастора, у якой гэтыя творы існуюць, можа быць рэальнай ці ілюзорнай.

***Архітэктура*** прадстаўлена будынкамі, збудаваннямі, а таксама іх комплексамі. Архітэктурныя збудаванні не толькі ўражваюць маштабнымі формамі, але і ствараюць умовы для камфортнай жыццядзейнасці чалавека.

***Выяўленчае мастацтва*** аб'ядноўвае ў сабе жывапіс, графіку і скульптуру. У *жывапісе* з дапамогай колеру на плоскай паверхні ўзнаўляецца рэальная ці фантастычная атмасфера тых імгненняў, якія застаюцца ў памяці людзей на стагоддзі. У *графіцы* асновай твораў з'яўляецца малюнак.



Палацава-паркавы комплекс Цвінгер (г. Дрэздэн, Германія)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

З дапамогай ліній, штрыхоў, кропак, плям мастак стварае арыгінальны вобраз. У *скульптуры* майстар перадае паставы, рухі, жэсты ў рэальным аб'ёме. Для гэтага скульптар выкарыстоўвае цвёрдыя або пластычныя матэрыялы.




**Мартыро́с Сар'я́н.**
Макі

Прадметы ***дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*** прыгожыя і карысныя адначасова. Пры іх стварэнні майстар улічвае не толькі прыгожасць знешняга выгляду, але і практычную значнасць.



**Рэнэ Кустур'е́.** Збан.
**Антуане́т Маркеро́н.**
Талерка

***Часавыя віды мастацтва***. Мастацкія вобразы, увасобленыя ў творах часавых відаў мастацтва — музыкі, літаратуры, — мы не маем магчымасці ўбачыць. Таксама мы не можам да іх дакрануцца. Але можам адчуць развіццё музычнага вобраза ці падзеі, якая разгортваецца ў часе.



Івянецкая кераміка
(Беларусь)

...Однажды карандаш цветной
Пройдётся по всему листу,
Его заполнив пустоту.
И синим будет небосвод,
И красным будет пароход,
И чёрным будет в небе дым,
И солнце будет золотым!

*Сяргей Міхалкоў. Ліст паперы*

У *музыцы* пэўны настрой ствараецца з дапамогай разнастайнасці гукаў, рытмаў... У *літаратуры* з дапамогай слова раскрываюцца вобразы, пачуцці, характарызуецца абстаноўка, у якой адбываецца якое-небудзь дзеянне.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

***Прасторава-часавыя віды мастацтва***. У творах прасторава-часавых відаў мастацтва дзеянне адбываецца ў часе і ў прасторы адначасова. Напрыклад, у *танцы* асновай мастацкага вобраза з'яўляюцца рухі і паставы танцораў, створаныя ў прасторы. А вось змена гэтых рухаў і пастаў адбываецца ў часе.

Межы прасторы прасторава-часавых відаў мастацтва — *танца*, *цырка*, *тэатра* і *кіно* — акрэслівае сцэна або пляцоўка, на якіх адбываецца асноўнае дзейства.

***Жанр у мастацтве.*** Больш дакладную характарыстыку твора мастацтва дае *жанр*. На жанры падзяляецца большасць відаў мастацтва. Хоць некаторыя з іх, напрыклад архітэктура, такога падзелу не маюць.

Вялікай разнастайнасцю жанраў адрозніваецца выяўленчае мастацтва. У жывапісе, скульптуры, графіцы жанр вызначаюць на аснове таго, *што* мастак паказвае.

Напрыклад, на *партрэце* мастак паказвае аднаго ці некалькіх людзей, характарызуючы іх знешняе аблічча, эмацыянальны стан, род заняткаў. *Нацюрморт* прысвечаны адлюстраванню



**Валянцін Сяроў.**
Партрэт балерыны Тамары Карсавінай



**Канстанцін Селіханаў.**
Муза оперы

**Жанр** — характарыстыка мастацкага твора, якая вызначае яго сюжэт і асаблівасці.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

неадушаўлёных прадметаў: посуду, кветак, пладоў… У *пейзажы* ўвасабляюцца вобразы прыроды.

У творах *анімалістычнага* жанру адлюстроўваюцца вобразы жывёльнага свету. У *гістарычным* жанры ў цэнтры ўвагі мастака — падзеі мінулага.

Мастацкія творы адносяцца да пэўных відаў і жанраў мастацтва. Разуменне жанрава-відавых асаблівасцей дапаможа арыентавацца ва ўсёй разнастайнасці мастацтва.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Пералічыце асноўныя віды мастацтва. Пры абгрунтаванні свайго адказу выкарыстоўвайце мастацкія творы, прадстаўленыя ў параграфе і электронным дадатку.

2. Падрыхтуйце для аднакласнікаў віктарыну «Жанры выяўленчага мастацтва», выкарыстаўшы ўпадабаныя мастацкія прыклады, з якімі вы пазнаёміліся ў пятым класе. Прыклады жанравай разнастайнасці прапанаваны таксама ў электронным дадатку да вучэбнага дапаможніка для шостага класа.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах першую частку анімацыйнага фільма «Пластылінавая варона» рэжысёра Аляксандра Татарскага на сюжэт верша «Пра карціны» Аляксандра Кушнера. Пра якія жанры жывапісу расказваюць аўтары? Паспрабуйце гэтак жа, як і дзеці з мультстудыі, малюнкі якіх скарыстаны ў фільме, стварыць карціну ў адным з жанраў. Чаму вы выбралі менавіта гэты жанр? Раскажыце, што ў вас атрымалася.

## § 3. ВУЧЫМСЯ РАЗУМЕЦЬ ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

Натхненне мастака — галоўны штуршок да нараджэння твора мастацтва. Менавіта натхненне ляжыць у аснове стварэння мастацкіх вобразаў, задум, кампазіцый будучых твораў. А вось рэалізаваць задуманае аўтару дапамагаюць *сродкі мастацкай выразнасці.*



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



**Рэмбрант.**
Мастак у майстэрні

***Жывапіс.*** У стварэнні жывапісных твораў галоўным сродкам выразнасці з’яўляецца *колер*. Галандскі мастак 17 стагоддзя Ры́мбрант выкарыстоўвае стрыманыя колеры, плаўныя танальныя пераходы. Цёплая *колеравая гама* карцін дазваляе перадаць атмасферу ўтульнасці. Цёмны каларыт жывапіснага палатна падкрэслівае жыццёвую рэчаіснасць таго часу.



**Наталля Ганчарова.**
Паўлін пад яркім сонцам.
Стыль егіпецкі

Руская мастачка 20 стагоддзя Наталля Ганчарова ў кампазіцыі «Паўлін пад яркім сонцам», наадварот, выкарыстоўвае яркія, кідкія фарбы. Дзякуючы кантрасным колеравым спалучэнням на палатне ўзнікае графічна акрэслены сілуэт заморскай птушкі. Спалучэнне аранжава-чырвоных і фіялетава-сініх тонаў перадае экзатычнасць вобраза.

Непаўторныя жывапісныя кампазіцыі стварае і іншы мастак 20 стагоддзя — Піт Мандрыян. Сваё стаўленне да жыцця ён выказвае з

**Сродкі мастацкай выразнасці** — гэта асаблівая мастацкая мова, з дапамогай якой мастацтва з намі камунікуе.


Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

дапамогай яркіх колеравых плям, гарызантальных і вертыкальных ліній, геаметрычных фігур.

***Графіка.*** У графіцы на першы план выступае *малюнак*. З дапамогай контурных ліній мастак прарысоўвае фігуры. Штрыхі дапамагаюць прапрацаваць дэталі, стварыць аб’ём малюнка і святлоценявыя эфекты. У малюнках, якія нават не адпавядаюць нашаму ўяўленню пра рэчаіснасць, мастак карыстаецца інструментамі, уласцівымі графіцы. Напрыклад, ілюзію скажэння формы знаёмага прадмета перадае іспанскі мастак 20 стагоддзя Хуан Грыс у графічнай рабоце «Нацюрморт з гітарай».

***Скульптура.*** У скульптуры галоўным сродкам выразнасці з’яўляецца *аб’ёмная мадэліроўка*, гэта значыць прапрацоўка мадэлі ў аб’ёме. У залежнасці ад уласцівасцей скульптар выкарыстоўвае розныя спосабы яго апрацоўкі. Напрыклад, для дрэва — разьбу, для каменю — высяканне, для гліны — лепку.

Часам пластычныя вобразы настолькі рэалістычныя, што складана ўявіць, якімі сродкамі мастаку ўдалося іх стварыць. Гледзячы на скульптурную кампазіцыю «Мармуровая вуаль» італьянскага майстра 19 стагоддзя Рафаэля Монці, мы адчуваем здзіўленне. Ці сапраўды гэта работа выканана з мармуру? Ці можна настолькі дакладна перадаць у камені празрыстасць і лёгкасць тканіны?



**Піт Мандрыян.**
Кампазіцыя з чырвоным, сінім і жоўтым



**Хуан Грыс.**
Нацюрморт з гітарай



**Рафаэль Монці.**
Мармуровая вуаль



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

У скульптуры «Мінчанка» беларускі майстар Анатоль Анікéйчык стварыў не толькі партрэтны вобраз гараджанкі, але і паэтычна ўвасобіў вобраз вясны і пяшчоты. Прыгожая доўгая шыя, вытанчаныя рысы твару дзяўчыны захапляюць гледача. Ледзь прыкметны нахіл галавы і скіраванасць вачэй убок перадаюць яе задуменнасць і адухоўленасць.



**Анатоль Анікейчык.**
Мінчанка

Сродкі мастацкай выразнасці дапамагаюць мастаку выказаць эмоцыі і думкі, адносіны да рэчаіснасці.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Колер у кожнага чалавека выклікае свае пачуцці і свае асацыяцыі. Выберыце ў параграфе і электронным дадатку адзін твор мастацтва з арыгінальным колеравым вырашэннем. Пералічыце эпітэты, якімі вы ахарактарызавалі б гэты твор.

2. Эль Лісіцкі назваў створаныя ім вобразы персанажаў *фігурынамі*. Разгледзьце аднаго з такіх герояў, Забіяку, і падумайце, чаму мастак вырашыў даць сваім персанажам такую назву. Апішыце вобраз. З якіх геаметрычных фігур ён складаецца? Які ў Забіякі характар? Якое значэнне ў стварэнні вобраза мае колер?



**Эль Лісіцкі.**
Забіяка

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Выберыце любую геаметрычную фігуру (квадрат, прамавугольнік, піраміда). Размясціце яе ў цэнтры ліста фармату А4. Вызначыцеся з колерам, які вы будзеце выкарыстоўваць. Прыдумайце новы арыгінальны мастацкі вобраз.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

# § 4. ВУЧЫМСЯ РАЗУМЕЦЬ АРХІТЭКТУРУ, МУЗЫЧНАЕ І ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

***Архітэктура.*** У архітэктуры адзін з галоўных сродкаў мастацкай выразнасці — *аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя*. Спалучэнне разнастайных геаметрычных формаў рознага маштабу стварае аснову архітэктурных вобразаў. Сярод іх — і велічныя саборы, і грандыёзныя палацы. Прапарцыянальныя суадносіны формаў і дэталяў кампазіцыі дазваляюць архітэктарам перадаць пэўны рытм, які настройвае на ўспрыманне збудавання, задае эмацыянальны тон.

***Музыка.*** Музыка нараджаецца з дапамогаю *гукаў*. Пранізлівыя, рэзкія, загадкавыя, пяшчотныя, яны чаргуюцца адзін з адным па працягласці і вышыні і так утвараюць *мелодыю*. У мелодыі ўвасоблены мастацкі вобраз музычнага твора. Магчыма, таму яе часта называюць душой музыкі. Мелодыю можна паслухаць, праспяваць, прасвістаць ці выканаць на музычным інструменце.

Важнае значэнне ў развіцці мелодыі мае *рытм*. Мерны, спакойны рытм надае мелодыі лірычны характар, рэзкі і перарывісты — перадае трывогу і хваляванне.

У невялікай музычнай замалёўцы «Шум лесу» венгерскага кампазітара Фéрэнца Лíста на фоне лёгкіх, амаль празрыстых



Замак Бутрóн
у пас. Гаціка (Іспанія)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Палац Пуслоўскіх паблізу г. Косава (Беларусь) (фота В. У. Зелянко)

пераліваў у акампанеменце гучыць глыбокая выразная мелодыя. З дапамогай сродкаў музычнай выразнасці аўтар стварыў карціну вясновага лесу. Прагульваючыся разам з кампазітарам, мы прыслухоўваемся да ціхага шэпту лісця, спеву птушак, якія прыляцелі. Музычныя вобразы лесу навяваюць рамантычны настрой.



Куфэрак-церамок. Халмагорская разьба

***Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.*** Сярод усіх відаў мастацтва найбольшай разнастайнасцю сродкаў выразнасці вызначаецца дэкаратыўна-прыкладное. У ім могуць выкарыстоўвацца сродкі выразнасці, уласцівыя іншым відам мастацтва: жывапісу, скульптуры і нават архітэктуры. У дэкоры такіх твораў важнае месца займае *арнамент*. У кожнага народа сваё дэкаратыўнае афармленне прадметаў, якое адлюстроўвае ўяўленне людзей аб прыгажосці і будове навакольнага свету.



Беларускія тканыя паясы

**Арна́мент** — рытмічны ўзор, заснаваны на паўторы і чаргаванні элементаў.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Разумеючы выразныя сродкі розных відаў мастацтва, мы, гледачы і слухачы, лепш разумеем мастака і яго задуму.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Пералічыце сродкі выразнасці ў музыцы, жывапісе, графіцы і скульптуры, пра якія вы даведаліся на ўроках музыкі і выяўленчага мастацтва раней. Якія вядомыя вам сродкі выразнасці ў параграфе не былі названы?

2. На прыкладзе аднаго твора мастацтва, прапанаванага ў параграфе або электронным дадатку, растлумачце значэнне сродкаў выразнасці ў перадачы мастацкага вобраза.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Прыдумайце арыгінальны арнамент. Пастарайцеся, каб у ім прысутнічалі разнастайныя элементы (раслінныя, геаметрычныя) і незвычайны рытм. Прадумайце колеравую гаму арнаменту. Прарэкламуйце ў класе атрыманы ўзор. Дзе яго можна выкарыстоўваць? У якіх прадметах або вырабах?

## § 5. ВОБРАЗ ТВОРЦЫ Ў МАСТАЦТВЕ

Кожны мастак — *Творца*! Творцам называюць чалавека, які стварае ўнікальныя творы мастацтва. Гледачы і слухачы захапляюцца найвялікшымі творамі дойлідаў, скульптараў, кампазітараў... Такія творы дораць людзям асалоду. Магчыма, менавіта таму вобразу творцы прысвечана нямала твораў. У аснове сюжэта многіх з іх — дзіўныя, непаўторныя моманты нараджэння твора мастацтва. У гэтых момантах выказваюцца адносіны майстра да сваёй работы.

**Атрыбу́ты мастацтва** — прадметы, нязменна ўласцівыя канкрэтнаму віду мастацтва.

У поле зроку майстроў мастацтва трапляюць паэты, якія застылі ў роздуме над вобразам, і жывапісцы з пэндзлем і палітрай у руках, што



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

старанна выпісваюць дэталі кампазіцыі. Або дойліды, якія засяроджана праектуюць збудаванні; кампазітары, што энергічна запісваюць ноты будучай мелодыі; акцёры, якія віртуозна выконваюць ролі…

У розных відах мастацтва вобраз творцы раскрываецца індывідуальна. У выяўленчым мастацтве, адлюстроўваючы майстра за працай, аўтар узнаўляе толькі адно імгненне — тое, якое найбольш дакладна характарызуе творцу. Атрыбуты мастацтва дапаўняюць вобраз мастака, дапамагаюць зразумець сферу яго творчасці. У літаратуры, тэатры і кіно вобраз творцы раскрываецца рознабакова. У іх майстры мастацтва адлюстроўваюцца ў розныя моманты жыцця і творчасці, паступова раскрываюцца асаблівасці і знешняга аблічча, і ўнутранага свету.

***Паэт.*** Ствараючы вобраз рускага байкапісца Івана Крылова, скульптар Пётр Клот нібы выхапіў адзін момант з яго жыцця: майстар у штодзённай вопратцы сядзіць на камені з кнігай у руках. Нахмураныя бровы, апушчаныя куткі вуснаў, позірк, скіраваны ўдалячынь, перадаюць унутраную засяроджанасць пісьменніка. У час прагулкі па алеі байкапісец прысеў адпачыць. Магчыма, задумаўся над сюжэтам новага твора.



**Пётр Клот**.
Помнік Івану Крылову
(г. Санкт-Пецярбург)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



**Вера Мухіна.**
Помнік Пятру Чайкоўскаму
(г. Масква)

***Кампазітар.*** Вытанчанасць і паэтычнасць натуры перададзена ў вобразе рускага кампазітара Пятра Чайкоўскага, які ўвасобіла скульптар Вера Мухіна. Седзячы ў крэсле і абапіраючыся на пюпітр[1], на якім ляжыць партытура[2], кампазітар пагружаны ў творчы працэс. Яго вобраз адухоўлены, пастава вольная і раскаваная. Ён чуе новую мелодыю і з натхненнем туруе яе гучанню плаўным рухам рукі.

***Танцоўшчыца.*** На карціне «Партрэт танцоўшчыцы Камаргó» французскага жывапісца 18 стагоддзя Нікалá Ланкрэ́ перад намі таксама паўстае партрэтны вобраз творцы. Вядомая артыстка паказана ў час выканання харэаграфічнага нумара. Яе рухі лёгкія і вытанчаныя. Музыканты, якія акружаюць сцэнічную пляцоўку, старанна выконваюць свае партыі.



**Нікала Ланкрэ.**
Партрэт танцоўшчыцы
Камарго

[1] Пюпі́тр — падстаўка для нот.
[2] Партыту́ра — нотны запіс музычнага твора.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



**Карнеліс Врэдэнбург.**
Мастак Ян Бекер
за працай

***Жывапісец.*** Каб раскрыць вобраз жывапісца Яна Бе́кера, галандскі мастак Карне́ліс Врэдэнбу́рг выкарыстаў яркія фарбы, смелыя, рашучыя мазкі. Партрэтны вобраз з цяжкасцю пазнаецца на карціне. Мастак застаўся сам-насам з прыродай, удалечыні ад людской мітусні. Насунуўшы капялюш на бровы, Ян Бекер хавае твар ад пякучага сонца. Ён захоплены сваёй працай. Глядач не бачыць, што іменна малюе мастак на палатне: піша пейзаж ці выконвае эцюд для будучай сюжэтнай кампазіцыі. Вясёлкавыя колеры даюць магчымасць адчуць настрой творцы.

***Музыкант.*** Незвычайны вобраз музыканта стварыў на карціне «Віяланчэліст» беларускі мастак Марк Шагал. На фоне зімовага гарадскога пейзажа ў начной цішыні музыкант выконвае мелодыю. Яго цела намалявана ў форме віяланчэлі. Толькі на ўзроўні плеч пазнаюцца дэталі касцюма — каўнер кашулі, лацканы пінжака і гальштук, якія плаўна пераходзяць у абрысы



**Марк Шагал.**
Віяланчэліст



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

музычнага інструмента. Левая рука, заледзянелая ад холаду, трымае смычок, які слізгае па струнах. Побач верны сябар, козачка, падыгрывае на скрыпцы.

Майстры мастацтва расказваюць нам пра асаблівасці стварэння мастацкіх кампазіцый. З іх твораў мы даведваемся пра складаны працэс — творчасць.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Уважліва разгледзьце партрэты-вобразы ў параграфе і электронным дадатку. Якія атрыбуты ў малюнках творцаў даюць падказку пра іх прафесію?

2. Пазнаёмцеся з партрэтам-вобразам, які «намаляваў» паэт Леў Баляслаўскі. Як вы думаеце, каму прысвечаны гэтыя паэтычныя радкі? Абгрунтуйце свой адказ.

Ах, эта радость музыкой во мне
Так высоко восходит, не смолкая,
Что где-то в запредельной вышине,
В сиянии сплошном, в голубизне
В ней слышится уже тоска без края.

*Леў Баляслаўскі*

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Выканайце эскіз эмблемы аднаго з відаў мастацтва. Выкарыстоўвайце прыдуманую вамі эмблему як лагатып з рэкламнай мэтай — у буклеце або банеры.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Раздзел 2

ДОБРА СЛУХАЦЬ І ДОБРА АДКАЗВАЦЬ —
ГЭТА АДНА З НАЙВЯЛІКШЫХ ДАСКАНАЛАСЦЕЙ,
ЯКАЯ ТОЛЬКІ МАГЧЫМАЯ Ў РАЗМОВЕ.

*Франсуа́ дэ Ларошфуко́*

# ДЫЯЛОГІ Ў МАСТАЦТВЕ



Палацава-паркавы ансамбль у г. Нясвіжы (Беларусь)

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Усе мастацтвы «размаўляюць» з намі, гледачамі і слухачамі, з дапамогай сродкаў выразнасці: колеру, формы, лініі, мелодыі, рытму, пластыкі. Але, аказваецца, віды мастацтва могуць весці размову і паміж сабой.

Уважліва прыслухоўваючыся адзін да аднаго, віды мастацтва ўзаемаўзбагачаюцца: чэрпаюць новыя ідэі, запазычваюць новыя мастацкія элементы. Так узнікаюць новыя віды мастацтва.

Такім чынам, важным робіцца дыялог мастацтваў.

## § 6. ДЫЯЛОГ МАСТАЦТВАЎ

У дыялог адзін з адным уступаюць многія віды мастацтва. У адным з іх могуць прымяняцца сродкі выразнасці другога. Напрыклад, у жывапісе — сродкі выразнасці музыкі, а ў музыцы — сродкі выразнасці жывапісу. Дыялог дазваляе аўтарам больш ярка і эмацыянальна раскрываць мастацкія вобразы, тэмы, ідэі. Гэта ўзбагачае сродкі мастацкай выразнасці кожнага віду мастацтва: музыка робіцца «жывапіснай», а архітэктура і жывапіс — «гучнымі».

***Жывапіс і музыка.*** Адчуванне «музычнасці» жывапісных кампазіцый ствараюць не толькі вобразы і сюжэты, прапрацоўка формаў намаляваных мадэляў або прадметаў, але і колеравая гама, характар мазкоў. У гучных фарбах карціны «Дама ў садзе Сант-Адрэс» французскага жывапісца Клода Манэ́ чуюцца пералівы

**Дыяло́г** — размова, абмен выказваннямі і думкамі.



**Клод Манэ.**
Дама ў садзе Сант-Адрэс



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

мелодыі лета. Сінія, чырвоныя, жоўтыя, зялёныя колеравыя плямы, нібы раскіданыя па палатне, гарманічна зліваюцца ў меладычны напеў. Сузіраючы прыгажосць прыроды, дама ў белым адзенні запрашае гледача атрымаць асалоду ад музыкі летняй пары.

***Скульптура і музыка.*** Пластыка формаў у спалучэнні з «музычнасцю» кампазіцыі атрымала ўвасабленне ў помніку фінскаму кампазітару Яну Сібе́ліусу. Скульптурны твор складаецца з дзвюх самастойных частак, аб'яднаных толькі пастаментам (скалой). Такі арыгінальны прыём дазволіў аўтару стварыць непаўторны мастацкі вобраз. Першая частка кампазіцыі ўяўляе сабой партрэт творцы. Ён, здаецца, стварае мелодыю, якая напаўняе ўсю прастору парку разнастайнымі гукамі. Другая частка — арган са шматлікіх труб. Пры подыху ветру яны выдаюць гукі, якія аддалена нагадваюць фрагменты музычных твораў кампазітара.



**Эйла Хі́льтунен.**
Помнік Яну Сібеліусу
(Хельсінкі, Фінляндыя)

***Скульптура і танец.*** Пластыка — галоўны сродак выразнасці не толькі ў скульптуры, але і ў харэаграфічным мастацтве. Аднак гэта іншая пластыка. У скульптуры з дапамогай пластычнай прапрацоўкі матэрыялу мастак стварае статычныя вобразы, быццам адлюстраваныя на фотаздымку, а ў танцы пластычныя рухі выканаўцаў нараджаюць дынамічныя вобразы. Танцавальная пластыка здольная перадаць характар вобраза і тое, як ён змяняецца на працягу ўсяго харэаграфічнага твора.

Скульптура танцоўшчыцы, якую выканаў у мармуры італьянскі майстар Антóніа Канóва, увасабляе грацыю і вытанчанасць. Лёгкае адзенне, што нагадвае старажытнагрэчаскі хітон, падкрэслівае элегантнасць рухаў мадэлі. Выконваючы танцавальную кампазіцыю, артыстка рухаецца наперад. Ствараецца ўражанне, быццам яна зараз сыдзе са сцэны да гледача, зачароўваючы яго танцавальнымі рытмамі.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



**Антоніа Канова.**
Танцоўшчыца

***Архітэктура, скульптура, музыка.*** Трыумф гукаў адчуваецца ў мастацкім вобразе будынка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Дынамічныя формы збудавання адлюстроўваюць рытм і палётнасць мелодыі архітэктурнага вобраза. У навакольнай цішыні чуецца гук фанфар, пад якія выходзяць на сцэну артысты тэатра.

Скульптуры, устаноўленыя на фасадах, дапаўняюць мастацкі вобраз будынка тэатра музычнай сімволікай. Над уваходам узвышаецца скульптурная група на чале з апекуном мастацтва Апалонам, які трымае ў руках вянкі. Паабапал яго — музы, якія трубяць, услаўляючы мастацтва. Аб'ядноўвае кампазіцыю выкананая ў бронзе стужка з нотным станам.



**Іосіф Лангба́рд.**
Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь (г. Мінск)

Дзякуючы дыялогу розных відаў мастацтва ствараюцца ўмовы для нараджэння новых вобразаў, настрояў і характараў.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Уважліва разгледзьце выявы твораў мастацтва ў параграфе і электронным дадатку. Якія асацыяцыі з'явіліся ў вас пад уражаннем ад гэтых твораў?



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

2. Паслухайце ў электронным дадатку асноўную тэму першай часткі Канцэрта № 1 для фартэпіяна з аркестрам Пятра Чайкоўскага, якая гучыць у партыі аркестра і ў партыі саліста. Паразважайце, як дыялог праяўляецца ў жанры канцэрта.

ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. У гістарычным цэнтры горада Мінска ёсць унікальная лаўка Міха́ла Клеафа́са Агінскага. Мінчане называюць яе музычнай лаўкай. Калі на яе прысесці, можна пачуць знакаміты паланэз Агінскага «Развітанне з Радзімай». Выканана лаўка з металу. На спінцы адлюстраваны герб роду Агінскіх. Якія віды мастацтва, на ваш погляд, уступілі адзін з адным у дыялог?
Уявіце, што вы праектуеце для свайго горада, пасёлка музычныя лаўкі. Якія творы беларускіх кампазітараў і выканаўцаў вы ўключылі б у гэты праект? Выканайце эскіз такой лаўкі на лісце фармату А4, раскажыце пра вашу ідэю аднакласнікам.



**Вадзім Мацкевіч.** Музычная лаўка Міхала Клеафаса Агінскага (г. Мінск)

## § 7. САДРУЖНАСЦЬ МАСТАЦТВАЎ

***Садова-паркавае мастацтва.*** Многія віды мастацтва, узбагачаючы і дапаўняючы адзін аднаго з дапамогай сродкаў мастацкай выразнасці, аб'ядноўваюцца ў цалкам новыя садружнасці. Найбольш яркім прыкладам такой садружнасці з'яўляецца *садова-паркавае мастацтва* — мастацтва стварэння садоў і паркаў.

Вакол палаца Радзівілаў у горадзе Нясвіжы размешчаны ўнікальны парк. Цэлая чарада выразных формаў, утвораных дарожкамі, масткамі і разнастайнымі раслінамі, разлічана на павольныя прагулкі. Паркавае абрамленне надае пабудовам новы маляўнічы фон, своеасаблівую мудрагелістую раму. Дзякуючы гэтаму паляпшаецца ці нават змяняецца ўражанне ад архітэктурнага комплексу. Строгія формы палаца змякчаюцца плаўнымі лініямі дрэў. Цёплая колеравая гама палацавых сцен узбагачаецца фарбамі лістоты і



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

ігліцы. Роўнядзь вадаёма, падобна люстэрку, далікатна «размывае» і падвойвае гэту прыгажосць.

**Анса́мбль** — узгодненасць частак, якія ўтвараюць цэлае.

***Палацава-паркавы ансамбль.*** У садружнасці архітэктара і майстра садова-паркавага мастацтва з'яўляюцца незвычайнай прыгажосці палацава-паркавыя ансамблі. Выразныя сродкі ў іх нібы пераклікаюцца, любуючыся адзін адным і дэманструючы свае найлепшыя якасці.

Вось, напрыклад, палацава-паркавы ансамбль у горадзе Версалі ў наваколлі Парыжа. Вакол палаца раскінуўся велізарны парк. Акрамя дрэў у парку шмат дэкаратыўных басейнаў, кветнікаў і газонаў. Паглядзіце, якія багатыя ўзоры ўтвараюць дываны з травы, кустоў і кветак. Яны падкрэсліваюць веліч палацавай архітэктуры. Некалькі разоў на год садоўнікі перасаджваюць расліны ў кветніках. Тады палац змяняе свой убор, нібы рыхтуючыся да пэўнай падзеі.

Палацава-паркавы ансамбль «Пецяргоф» знаходзіцца ў горадзе Санкт-Пецярбургу (Расія). У ім, як і ў палацава-паркавым ансамблі Версаля, раскоша дэкору палацавых сцен і фантанаў пераклікаецца з зелянінай, кветкамі і вадой. У люстэрку водных басейнаў адлюстроўваюцца і прырода, і архітэктура, і скульптура, а струмені вады малююць дзівосныя ўзоры, якія нагадваюць вежы і піраміды.



Палацава-паркавы ансамбль у Версалі (Францыя)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Палацава-паркавы ансамбль у Пецяргофе (г. Санкт-Пецярбург, Расія)

Штогод, вясной, тут праводзіцца ўрачыстае адкрыццё фантанаў. Наведвальнікі з задавальненнем робяцца ўдзельнікамі святочнага прадстаўлення, у час якога ў садружнасць уступаюць розныя віды мастацтва.

***Музыка фантанаў.*** *Садружнасць архітэктуры, музыкі і харэаграфіі* стала асновай для дзівосных прадстаўленняў, у якіх вада — галоўная дзейная асоба. Струмені вады фантанаў, якія пад музыку ўздымаюцца да нябёсаў, зачароўваюць гледачоў сваім хараством. Струмені быццам танцуюць пад класічную і сучасную музыку. Непаўторныя не толькі форма і гучанне фантанаў, але і казачна-фантастычныя карціны, якія ствараюцца пры дапамозе вады і падсветкі.



Кржыжыкавы фантаны ў Празе (Чэхія)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Сцэна з літаратурна-музычнай кампазіцыі «Пунсовая кветачка» (цыкл «Казкі з аркестрам»). Чытае Кацярына Гусева

***Мастацкі праект.*** Прыкладам садружнасці музыкі, літаратуры і тэатральнага мастацтва з'яўляецца мастацкі праект «Казкі з аркестрам». У літаратурна-музычных кампазіцыях артысты тэатра і кіно чытаюць вядомыя творы для дзяцей у суправаджэнні сімфанічнага аркестра. Дырыжор аркестра не проста стварае музычны фон. Ён уважліва прыслухоўваецца да кожнага слова акцёра, каб своечасова падхапіць інтанацыю, узмацніць яе ці, наадварот, паслабіць. Такая *садружнасць мастацкага слова і музыкі* пашырае прастору казкі. Ва ўяўленні ўзнікаюць новыя вобразы. Музыка дапаўняе іх, выклікаючы ў слухача глыбокі эмацыянальны водгук.

**Фестыва́ль** — масавае свята, паказ дасягненняў розных відаў мастацтва.

***Фестываль.*** Садружнасць мастацтваў яскрава праяўляецца на розных фестывалях. Напрыклад, у горадзе Маладзечне праводзіцца Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі. Выступленні артыстаў, змяняючы адзін аднаго, ствараюць *садружнасць літаратуры і музыкі*.





Садружнасць мастацтваў на Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Фотаздымкі прадстаўлены Выдавецкім домам «Беларусь сёння»



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Госці Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» акунаюцца ў атмасферу *садружнасці ўсіх відаў мастацтва*. Дзякуючы гэтай садружнасці фестываль праходзіць асабліва ярка, таленавіта і дынамічна!

**Уступаючы ў садружнасць, віды мастацтва раскрываюцца новымі гранямі і сэнсамі, дэманструючы гледачам і слухачам арыгінальныя фарбы, лініі, формы.**

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Уважліва разгледзьце выявы палацава-паркавых комплексаў, прадстаўленыя ў параграфе і электронным дадатку. Выразныя сродкі якіх відаў мастацтва ствараюць іх непаўторнае аблічча?

2. Якое месца ў жыцці беларускага народа займае Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»? Назавіце віды мастацтва, якія ўступаюць у садружнасць.

3. У інфармацыйных крыніцах пазнаёмцеся з топ-5 спяваючых фантанаў: «Магічны фантан» у Барселоне, «Беладжыа» ў Лас-Вегасе, «Дубаі-фантан», фантан у Алімпійскім парку ў Сочы і святломузычны фантан у Мінску. Які з іх вам спадабаўся больш і чаму?

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

4. Выканайце творчую работу ў групах. Падбярыце музычны твор, які вам падабаецца і які вы хацелі б «убачыць» у спяваючым фантане. Праслухайце гэты твор уважліва. Падзяліце яго на часткі. Намалюйце кожную частку для спяваючага фантана. Абмяркуйце работы ў класе. Якія спяваючыя фантаны вам падаліся найбольш арыгінальнымі? Чаму?

## § 8. СІНТЭЗ МАСТАЦТВАЎ

Больш глыбокае злучэнне сродкаў выразнасці адбываецца ў *сінтэтычных відах мастацтва*. У іх элементы розных мастацтваў не проста суседнічаюць, а ўзаемапранікаюць адзін у аднаго. Вылучыць асобныя элементы ў сінтэтычных відах мастацтва складана. Кожны элемент цікавы як частка цэлага. Да сінтэтычных відаў мастацтва



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

адносяцца танец, тэатр, цырк, кіно. У другой палове 20 стагоддзя да іх далучылася камп’ютарнае мастацтва.

**Сінтэты́чныя віды мастацтва —** віды мастацкай творчасці, у якіх злучаюцца сродкі выразнасці розных відаў мастацтва.

***Цырк.*** Сінтэз, узаемапранікненне мастацтваў асабліва прыкметна ў цырку. Мы чуем бравурную музыку, бачым яркія фантастычныя касцюмы выканаўцаў. Па арэне струменяцца стужкамі рознакаляровыя агні пражэктараў. Цыркавыя артысты выконваюць надзіва складаныя і небяспечныя трукі, а клоўны напаўняюць арэну гучным смехам і неверагоднай весялосцю. Вядома, можна і дома паслухаць аўдыязапіс цыркавога марша, разгледзець фотаздымкі прадстаўлення. Аднак уражанне ад іх немагчыма параўнаць з тым, калі ўсе фарбы, усе выразныя сродкі розных мастацтваў зліваюцца ў цыркавой дзеі.

Беларускі скульптар Сяргей Бандарэнка стварыў фігуры, якія ўпрыгожваюць пляцоўку перад Беларускім дзяржаўным цыркам. Майстар перадаў незвычайнасць касцюмаў і музычных інструментаў, загадкавасць фокусаў і адвагу цыркавых гімнастаў. Але ўсе гэтыя скульптуры — толькі запрашэнне да цыркавога прадстаўлення. Сапраўдны цырк вось-вось з’явіцца на арэне і прадэманструе гледачам магчымасці розных відаў мастацтва!



**Сяргей Бандарэнка.**
Скульптуры на пляцоўцы перад Беларускім дзяржаўным цыркам (г. Мінск) (фота Аляксандра Марунова)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

***Мастацтва расказвае пра мастацтва.*** Нярэдка сінтэтычныя мастацтвы «цікавяцца» адно адным. Напрыклад, з кінастужак мы даведваемся пра тэатр, а з тэлеперадач — пра кіно.



Кадр з мультфільма «Канікулы Баніфацыя» (рэжысёр Фёдар Хітрук)

Выдатны майстар савецкай анімацыі Фёдар Хітру́к стварыў мультфільм «Канікулы Баніфа́цыя». Галоўны герой — цыркавы артыст леў Баніфацый — прыязджае на канікулы да бабулі. Але ў гасцях ён не здолеў утрымацца і паказаў сваё майстэрства. Атрымліваецца, самае лепшае з таго, што ёсць у цырку, можна забраць з сабой!

***Ад кніжнай ілюстрацыі да кінавобраза.*** Нярэдка цыркавыя артысты выступаюць у касцюмах усходняга стылю: на іх атласныя шаравары, халаты, чалма. Гэта звязана з тым, што многія цыркавыя трукі нарадзіліся на Усходзе.



**Іван Білібін.**
Ілюстрацыя да казкі «Дыван-самалёт»

Тэма Усходу прыцягвае многіх майстроў мастацтва. Пісьменнікам цікавыя нязвыклыя для еўрапейцаў парадкі і традыцыі народаў усходніх краін. Мастакам — маляўнічасць убораў і экзатычная прырода. Самабытныя сюжэты арабскіх казак абудзілі фантазію многіх дзеячаў мастацкай культуры.

Сярод іх — рускі мастак Іван Білі́бін. Ён маляўніча праілюстраваў усходнюю казку «Дыван-самалёт». На старонках кнігі аб’ядноўваюцца літаратура і выяўленчае мастацтва.



Сцэна з тэлеспектакля «Алі-Баба і сорак разбойнікаў» (рэжысёр Алег Рабаконь)

У тэлевізійным спектаклі казку «Алі-Баба і сорак разбойнікаў» ярка і займальна расказвае акцёр Веніямін Смехаў. Тут усе персанажы спяваюць. Кожнага героя



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

характарызуе не толькі яркі касцюм, але і мелодыя з усходнімі матывамі. Аўтар вядзе аповед ад імя Мустафы. Ён настройвае гледача на сустрэчу з героямі п'есы. Акцёрскае майстэрства аб'ядноўваецца з мастацкім словам і музыкай.

Адзін з самых знакамітых спектакляў Дзяржаўнага акадэмічнага Цэнтральнага тэатра лялек імя С. У. Абразцова — «Чароўная лямпа Аладзіна». Усходні каларыт у пастаноўцы падкрэсліваецца грацыёзнымі рухамі лялек, дэкарацыямі і музыкай.

Фігура грознага джына Кашкаша засланіла пустынны пейзаж і горад з шыкоўнымі палацамі. На такім фоне Аладзін выглядае безабаронным. Гэты эпізод падкрэслівае смеласць і рашучасць юнака. Пазней ён не пабаіцца ўступіць у барацьбу з вераломным візірам.

Яркія ўсходнія вобразы сустракаюцца і ў мастацкім фільме «Чароўная лямпа Аладзіна» рэжысёра Барыса Ры́царава. Джын прадстаўлены як мультыплікацыйны вобраз. Да выразных сродкаў літаратуры, выяўленчага і музычнага мастацтва, акцёрскага майстэрства дадаюцца выразныя сродкі мастацтва анімацыі — «ажыўленне» персанажаў.



Сцэна са спектакля «Чароўная лямпа Аладзіна». Дзяржаўны акадэмічны Цэнтральны тэатр лялек імя С. У. Абразцова (г. Масква, Расія)



Кадр з фільма «Чароўная лямпа Аладзіна» (рэжысёр Барыс Рыцараў). Цэнтральная кінастудыя імя Максіма Горкага

Сінтэз мастацтваў — гэта не проста выкарыстанне сродкаў выразнасці розных відаў мастацтва. Гэта іх арганічнае злучэнне, дзякуючы якому ўзмацняецца эмацыянальнае ўздзеянне твора мастацтва на гледача і слухача.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Ці бывалі вы на цыркавым прадстаўленні? Падзяліцеся сваімі ўражаннямі. Якія цыркавыя нумары вы пазналі на фотаздымках у электронным дадатку? Якія б дадалі?

2. Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах фрагмент мультфільма «Канікулы Баніфацыя» Фёдара Хітрука. Якія цыркавыя трукі супадаюць з трукамі, узноўленымі ў скульптурнай кампазіцыі Сяргея Бандарэнкі?

3. Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах фрагменты спектакля «Чароўная лямпа Аладзіна» і фільма з аднайменнай назвай. Якія фрагменты казкі могуць паслужыць сюжэтам для цыркавога прадстаўлення? Якія нумары маглі б выканаць яе?

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

4. Выканайце да аднаго з фрагментаў казкі «Алі-Баба і сорак разбойнікаў» каляровую ілюстрацыю. Патлумачце, які фрагмент казкі вы выкарыстоўвалі і чаму. Паразважайце, як гэту ілюстрацыю можна «ажывіць» у іншых відах мастацтва.

# § 9. ТВОРЧЫ ЎРОК: МАЛЮЕМ МУЗЫКУ

Многія майстры мастацтва лічылі, што не толькі жывапіс, але і музыка звязана з колерам. Напрыклад, музыка мастака і кампазітара Мікалоюса Чурлёніса насычана выяўленчымі элементамі, а жывапіс — музыкай. Асабліва яскрава злучэнне жывапісу і музыкі выявілася ў яго творах, звернутых да вобраза мора — у сімфанічнай паэме «Мора» і маляўнічым трыпціху[1] «Саната мора».

Маляўнічы твор невыпадкова атрымаў музычную назву. Трыпціх «Саната мора» пабудаваны па прынцыпах музычнай кампазіцыі. Асноўныя музычныя тэмы спачатку развіваюцца самастойна, а затым узаемадзейнічаюць адна з адной. Кожная з частак адлюстроўвае пэўны стан: крайнія па сваім характары кантрасныя сярэдняй — спакойнай, улагоджанай, сузіральнай.

[1] Тры́пціх — твор мастацтва, які складаецца з трох частак.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Алегра Андантэ Фінал

**Мікалоюс Чурлёніс.** Трыпціх «Саната мора»

Карціны Мікалоюса Чурлёніса «гучаць». А сімфанічныя паэмы — адлюстроўваюць яркія карціны прыроды з дапамогай музычных сродкаў выразнасці.

Узаемасувязь жывапісу і музыкі выяўляецца і ў тых характарыстыках, якімі мы надзяляем музычныя вобразы: «светлы гук», «празрыстая мелодыя». Слухаючы музычны твор, людзі ва ўсе часы імкнуліся спалучыць нябачны музычны свет з бачнымі вобразамі.

Паслухайце фрагмент сімфанічнай паэмы «Мора».

Ці супадаюць вобразы, узніклыя ў вашым уяўленні, з вобразамі, якія вы бачыце на карцінах?

Выканайце асацыятыўны малюнак пад музыку М. Чурлёніса паводле плана:

- прыслухоўваючыся да музыкі, намалюйце на лісце фармату А4 вялікую колькасць выпадковых ліній, не задумваючыся над тым, што ў вас атрымліваецца;
- угледзьцеся ў ваш малюнак уважліва і раскажыце, што вы ў ім убачылі;
- дапрацуйце вобраз усвядомлена, прарысаваўшы патрэбныя элементы.

Звярніцеся да інфармацыйных крыніц і адкажыце на пытанне «Што такое каляровы слых?»



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Раздзел 3

СВЯТА ПАТРЭБНА ЗАЎСЁДЫ НАСІЦЬ З САБОЙ...

*Эрнэ́ст Хемінгуэ́й*

# СВЯТА Ў ЖЫЦЦІ ЛЮДЗЕЙ



**Ганна Сілівончык.** Самая зорная ноч

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Свята — нязменны спадарожнік чалавека. Дзень нараджэння, Новы год, Масленіца, Каляды і іншыя святы займаюць асаблівае месца ў нашым жыцці. Іх чакаюць, ім радуюцца, імі захапляюцца…

Яркія падзеі ў жыцці, такія як сустрэча вясны, збор ураджаю, вяселле ці нараджэнне дзіцяці, людзі заўсёды суправаджалі песнямі, танцамі, гульнямі.

Таму святочныя дні адрозніваюцца ад будзённых. На некаторы час чалавек пачуваецца вольным, забывае пра клопаты. Святы напоўнены аптымізмам, маюць жыццесцвярджальны характар, прыўносяць у жыццё людзей радасць і весялосць. І дарослыя, і дзеці ў чаканні свята знаходзяцца ў прыўзнятым настроі, у прадчуванні яскравых, цікавых падзей.

## § 10. СВЯТЫ Ў РОЗНЫХ КУЛЬТУРАХ СВЕТУ

Традыцыі многіх свят сягаюць каранямі ў глыбокую старажытнасць. Найважнейшыя з іх былі звязаны з верай у звышнатуральныя сілы, якія ўвасаблялі магутнасць прыроды. Жадаючы атрымаць

**Свя́ты** — урачыстыя дні, вызначаныя для шанавання якой-небудзь падзеі, важнай для асобнага чалавека, сям'і ці цэлага народа.



Абрад перад паляваннем



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Фрагмент штандара (старажытны горад Ур, Месапатамія)

іх заступніцтва, прыцягнуць іх на свой бок ці, наадварот, адпудзіць, чалавек здзяйсняў розныя абрады і рытуалы. Напрыклад, некаторыя народы выконвалі танцы са спевамі вакол вогнішча, арганізоўвалі баль і ўзносілі малітвы да багоў або духаў.

Нязменным спадарожнікам свята здаўна была музыка. Сумесныя спевы і руханне ў агульным рытме давалі людзям адчуванне важнасці і значнасці таго, што адбываецца. Музыка гучала і на ўрачыстасцях у гонар ваенных перамог, здабытых старажытнымі кіраўнікамі, і на царскіх баляваннях. Адзін з эпізодаў мірнага жыцця шумераў — свята ля царскага трона — увасоблены ў штандары (каменнай мазаіцы). Мазаічная кампазіцыя выкладзена з кавалачкаў лазурыту і чырвонага вапняку. Невядомы нам майстар не толькі адлюстраваў вяльможаў, што паднімаюць чары з віном у гонар цара, але і з асаблівай увагай паказаў музыканта, які выконвае адпаведную моманту мелодыю на ліры.

***Каляндарныя святы.*** Прайшло шмат тысяч гадоў, перш чым людзі пачалі адзначаць святы ў пэўныя дні. Час для ажыццяўлення святочных абрадаў вызначаўся паводле прыродных рытмаў і ўсталяваных традыцый. Так паступова склаўся каляндар, у якім кожнаму бажаству, з'яве прыроды, падзеі знайшлося пэўнае месца. Многія каляндарныя святы былі адлюстраваны ў творах мастацтва.

У многіх краінах Еўропы ў першыя дні мая адзначаюць свята вясны. Яно сімвалізуе адраджэнне прыроды, яго атрыбут — Майскае дрэва. Вытокі гэтай святочнай традыцыі ўзыходзяць да



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



**Пі́тэр Мі́лер.** Майскае дрэва

язычніцкіх культаў дрэў, якія лічыліся сімваламі ўрадлівасці і ўладкавання свету, мастамі паміж людзьмі і багамі.

У Англіі, да прыкладу, Майскае дрэва ўсталёўваюць у першы панядзелак мая на плошчах усіх населеных пунктаў. Яно ўяўляе сабой шост з дыскам на верхавіне, упрыгожаны рознакаляровымі стужкамі і кветкавымі гірляндамі. Народныя гулянні і вулічныя шэсці праходзяць на працягу ўсяго дня. Удзельнікі свята выбіраюць Караля і Каралеву мая, але самы галоўны абрад адбываецца каля шаста. Юнакі і дзяўчаты танцуюць ля Майскага дрэва так, каб сплесці і расплесці стужкі вакол яго.

***Рэлігійныя святы.*** У культуры розных краін і народаў асобнае месца займаюць рэлігійныя святы. У царкоўным календары хрысціян адным з галоўных свят з'яўляецца Вялікдзень. Свята Уваскрэсення Хрыстовага, якое адзначаецца пасля Вялікага посту, мае шматвяковую традыцыю. Да яго рыхтуюць шчодры стол, пякуць кулічы, фарбуюць яйкі.



**Аркадзій Пластаў.**
Велікодны нацюрморт
(фрагмент)

У «Велікодным нацюрморце» мастак Аркадзій Пла́стаў адлюстраваў сімвалы Вялікадня. Фарбаваныя яйкі ў шкляной вазачцы пад яркажоўтай плямай лімона, пульхны куліч,



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Свята агню ў Шатландыі



Фестываль кветак (Нідэрланды)

тварожная пасха азначаюць новае жыццё. На першым плане размешчана фарфоравая фігурка ягняці як адзін з сімвалаў Ісуса Хрыста. Папяровыя кветкі на святочнай ежы сімвалізуюць Багародзіцу. У пузатым імбрычку адбіваецца акно, праз якое быццам даносіцца звон, нагадваючы людзям пра чысціню веры.

***Нацыянальныя святы.*** У многіх народаў існуюць свае нацыянальныя святы. Яркія і незвычайныя, яны збіраюць не толькі жыхароў той ці іншай краіны. Госці спецыяльна прыязджаюць з розных куткоў планеты, каб стаць гледачамі або ўдзельнікамі ўрачыстасцей.

Самыя маштабныя і запамінальныя святы ў свеце — фестываль кветак у Галандыі (Нідэрланды), свята агню ў Шатландыі (Вялікабрытанія), светлавое шоу ў Германіі, фестываль фарбаў у Індыі і свята ліхтароў у Кітаі.

***Дзяржаўныя святы.*** У большасці краін свету ёсць асаблівыя святы — дзяржаўныя. У гэтыя дні адзначаюць гадавіны найважнейшых падзей у гісторыі краіны. Дзяржаўныя святы — сімвал яднання




Святочнае шэсце ў Дзень Незалежнасці (г. Мінск, Беларусь)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

народа. Яны напаўняюць людзей гонарам за сваю краіну, агульнымі ўспамінамі і надзеямі.

У Рэспубліцы Беларусь галоўнае дзяржаўнае свята — Дзень Незалежнасці — адзначаецца 3 ліпеня. У гэты дзень у 1944 годзе адбылося вызваленне горада Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Штогод 3 ліпеня ў горадзе ладзяцца святы і гулянні. У мастацкім афармленні свята спалучаюцца і традыцыйныя віды мастацтва (танец, музыка, жывапіс), і адносна новыя для нашага рэгіёна (напрыклад, мастацтва феерверку).

***Сямейныя святы.*** У розных кутках планеты людзі святкуюць найважнейшыя падзеі, звязаныя з жыццём іх сем'яў, — нараджэнне, паўналецце, заканчэнне вучобы, вяселле, юбілей... Гэта сямейныя святы. У кожнай краіне існуюць свае традыцыі святкавання такіх падзей. Многія важныя для сваякоў урачыстасці суправаджаюцца сямейна-бытавымі абрадамі. Абрадавыя дзеянні маюць характар таінства і здзяйсняюцца сярод родных і блізкіх. І няхай у кожнай мясцовасці, у кожнай сям'і ў святкаванне дадаюць нешта сваё, адно застаецца нязменным: музыка, танцы, смех і добры настрой спадарожнічаюць усім сямейным святам. Жадаючы па-асабліваму адзначыць сямейную падзею, людзі ўпрыгожваюць жытло, рыхтуюць пачастункі. З надзеяй і радасцю чакаюць сяброў і блізкіх, прапануюць ім цікавыя забавы і падарункі.



**Мікалай Багда́наў-Бе́льскі.**
Імяніны настаўніцы



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Свята — гэта заўсёды ўрачыстасць. Яно стварае настрой, дае магчымасць выявіць сябе ў розных відах мастацтва. Жаданне людзей урачыста святкаваць значныя падзеі ва ўсе часы застаецца нязменным.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Паглядзіце фотаздымкі ў электронным дадатку і відэафрагменты ў інфармацыйных крыніцах, дзе адлюстраваны моманты свят у розных краінах. На якім з іх вы хацелі б пабываць? Якія віды мастацтва вядуць дыялог адзін з адным у час гэтых урачыстасцей? Якія асаблівасці свят вам запомніліся? Чаму?

2. Якое свята вы любіце адзначаць у вашай школе? Сродкі выразнасці якіх відаў мастацтва выкарыстоўваеце для яго афармлення? Чым ваша школьнае свята адрозніваецца ад іншых? Што новага вы ў яго прыўнеслі?

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Прыдумайце і выканайце ў групах маляўнічую паштоўку-віншаванне з адным са свят, напрыклад з Новым годам. Адлюструйце ў ёй атрыбуты свята, якія робяць яго незвычайным і пазнавальным. Растлумачце сваю задуму.

## § 11. ТАІНСТВА НАРОДНЫХ СВЯТ

Народныя святы займаюць цэнтральнае месца ў традыцыйнай культуры славян і маюць глыбокія гістарычныя карані. Для нашых продкаў-земляробаў пачаткам усяго жывога, крыніцай дабрабыту была сама прырода. Менавіта яна вызначыла дні асаблівых урачыстасцей і шанавання жыватворных сіл.

***Каляндарныя святы славян.*** Ужо ў старажытнасці славяне заўважылі, што змена пораў года адбываецца цыклічна і прадказальна. Паўтарэнне прыродных з’яў з году ў год падказала час галоўных абрадавых дзеянняў. Змена пораў года, дні першага выгану жывёл на пашу, сяўбы ці збору ўраджаю рабіліся перыядам



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



**Ганна Сілівончык.**
Шпакі прыляцелі



Цацка-свістулька
ў форме птушкі



**Вікторыя Гармазá.**
Родныя мясціны Беларусі
(аплікацыя саломкай
на куфры)

асаблівых урачыстасцей, калі нашы продкі пры дапамозе абрадаў і рытуалаў імкнуліся заручыцца падтрымкай звышнатуральных сіл.

З прыходам хрысціянства на нашы землі язычніцкія рытуалы славян спляліся з традыцыямі новай рэлігіі. У кожным рэгіёне пад уплывам іншых культур абрады дапаўняліся новымі элементамі. Але самі абрадавыя дзеянні нязменна захоўваліся.

Асаблівасці побыту беларусаў, іх рытуалы і абрады знайшлі адлюстраванне ў традыцыі *каляндарных* і *сямейна-бытавых* свят.

***Гуканне вясны.*** Адным з галоўных у каляндарным цыкле беларусаў было святкаванне Гукання вясны. Развітанне з зімой і сустрэча вясны былі падрыхтоўкай да будучых палявых работ. Таму шанаванне маці-зямлі бачылася як неабходны элемент абраду. Усе рытуалы і дзеянні, якія здзяйсняліся ў час свята, былі накіраваны на абуджэнне прыроды пасля доўгага зімовага сну.

Жавароначкі, прыляціце,
Зямлю-матухну абудзіце
І дождыкам напаіце,
Каб волікаў накарміла.
Каб травачкі нарасціла...

*Народная песня*



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Абрад «Гуканне вясны» традыцыйна ўключаў трайны абход вёскі. На ўзвышшы — узгорку — ладзілі галоўнае дзеянне. Распальвалі вогнішча, каб сагрэць яшчэ застылую зямлю. Каля вогнішча вадзілі карагоды з песнямі, у якіх згадваліся птушкі і жывёлы, звязаныя з вясной.

Да Гукання вясны гатавалі здобную выпечку ў форме птушачак. Булачкамі і печывам частавалі ўсіх удзельнікаў абраду. Дзеці выразалі жаўрукоў ці буслоў з паперы і падкідалі ў неба. Майстры-рамеснікі ляпілі фігуркі птушачак з гліны. Часта гэта былі цацкі-свістулькі ў форме пеўніка, качачкі, якія мелі яркую размалёўку. Паводле павер'яў, свістам можна было адагнаць нячыстую сілу і прывабіць шчасце.

***Купалле.*** Сярод каляндарных абрадаў летняга цыкла найбольш маштабна святкавалі дзень летняга сонцастаяння — Купалле, ці *свята Івана Купалы*. У адрозненне ад іншых каляндарных абрадаў, яго праводзілі ноччу. Купалле лічыцца самым містычным абрадам.

Адным з галоўных рытуалаў на Купалле быў пошук таямнічай папараць-кветкі. У начным паўзмроку дзяўчаты шукалі таямнічую кветку, жадаючы здабыць шчасце, дабрабыт і каханне.

Існаваў звычай на Купалле пускаць па рацэ вянкі, сплеценыя з красак. Вянкі плялі дзяўчаты напярэдадні святкавання. Славяне верылі, што гэтай ноччу адбываюцца цуды. Лічылася, што тая дзяўчына, чый вянок прыстане да берага, абавязкова сёлета выйдзе замуж.



**Міхаіл Філіповіч.**
На Купалле



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Як і ў час іншых традыцыйных свят, прысвечаных сонцу, на Купалле палілі вогнішчы. У іх цэнтры ўсталёўвалі драўлянае кола як сімвал свяціла, агонь разводзілі гарачы і яркі. Праз полымя, трымаючыся за рукі, пераскоквалі маладыя пары — юнакі і дзяўчаты. Лічылася, што так яны змацоўваюць свае адносіны.

**Тэатраліза́цыя —** дзея, у якой спецыяльна апранутыя ўдзельнікі паводзяць сябе і як звычайныя людзі, і як пэўныя персанажы.

***Каляды.*** Зімой беларусы святкавалі Каляды. На свята ў гонар зімовага сонцастаяння ладзілі гулянні, у якіх удзельнічалі дарослыя і дзеці. Калядніки, ці калядоўшчыкі, апраналіся, ствараючы казачных персанажаў, бралі з сабой вялікую зорку на шасце і пад песні і скокі хадзілі ад хаты да хаты, віншавалі гаспадароў і збіралі пачастункі.

Касцюмы калядоўшчыкаў вобразна раскрывалі сутнасць абраду. Галоўным персанажам была Каза, апранутая ў вывернуты кажух, які нагадваў поўсць жывёлы. Для Казы рабілі маску — з тканіны ці пап’е-машэ́. Да яе звярталіся з прыпеўкамі, запрашалі паскакаць. Звычайна ролю Казы выконваў хлопчык. Вадзіў яе Павадыр — часцей самы дарослы ўдзельнік свята.

Таксама сярод калядных персанажаў былі Мядзведзь, Конь і Бусел. На беларускіх землях гэтыя жывёлы са старажытных часоў лічыліся свяшчэннымі. Удзельнічалі ў абрадзе музыканты і Механоша — ён збіраў пачастункі ў мех.

Каляды — свята вясёлае. Калядоўшчыкі спявалі песні, забаўлялі ўсіх сустрэчных жартамі-прыгаворкамі і заклікалі гаспадароў хаты не скупіцца на пачастунак — тады і ў новым годзе ў іх будзе багаты стол.

Музыка, літаратура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, пераплятаючыся, ператвараюць святочную дзею ў *тэатралізацыю*.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

***Масленіца.*** Масавым святам, якое сімвалізуе адступленне зімы, у славянскіх народаў з'яўляецца Масленіца. Святкаванне развітання з зімой доўжылася цэлы тыдзень. У гэтыя дні беларусы ладзілі шырокія гулянні, апраналі яркую шматколерную вопратку, якая нагадвала россып кветак. Дзеці і моладзь каталіся на конях. Запрэжкі ўпрыгожвалі каляровымі стужкамі і бразготкамі.

Ай, как мы Масленицу дожидали,
Дожидали, люли, дожидали.
Сыром горушки укладали,
Укладали, люли, укладали.
Сверху маслицем поливали.

*Народная песня «Масленіца гадавая»*

Абавязковы атрыбут свята — чучала Масленіцы, зробленае з сухіх галін і рыззя. У апошні дзень гулянняў яго спальвалі. Лічылася, што пасля спальвання Масленіца перадасць сваю энергію палям, абароніць іх і прынясе багаты ўраджай.

На карціне «Масленіца» рускі мастак Барыс Кустодзіеў перадаў атмасферу карнавалу, якая пануе на гуляннях. Яркія фарбы напаўняюць звонкай музыкай казачны гарадскі пейзаж. Зямля, дрэвы, дахі дамоў яшчэ накрыты шчыльным снежным футрам, але людзі




**Барыс Кустодзіеў.**
Масленіца



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

ўжо з нецярпеннем чакаюць вясну. Баяры, купцы, сяляне — усе выйшлі на вуліцы горада правесці зіму.

Святкаванне Масленіцы не абыходзілася без бліноў. Бліны выпякаліся пышныя і роўныя, паколькі сімвалізавалі сонца. У народзе казалі: чым больш з'ясі бліноў на Масленіцу, тым хутчэй прыйдзе лета!

Масавыя шэсці, гулянні, гульні, забавы, песні, танцы, аб'яднаныя ў тэатралізаваныя дзеі, напаўнялі весялосцю гарады і вёскі. Святы аб'ядноўвалі людзей. Дарослыя перадавалі традыцыі маладому пакаленню, дзеці вучыліся паважаць і любіць родную прыроду, традыцыі і культуру.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія сямейныя святы вы ведаеце? Назавіце іх галоўныя атрыбуты. Раскажыце, як яны праходзяць. Як звязаны гэтыя святы з традыцыйнымі абрадамі?

2. Разгледзьце фотаздымкі і відэафрагменты народных свят у электронным дадатку. Падумайце, які сімвал аб'ядноўвае галоўныя святы беларусаў: Каляды, Масленіцу і Купалле. Патлумачце свой адказ.

3. Якія песні суправаджаюць каляндарныя святы Гуканне вясны, Купалле, Каляды, Масленіцу? Паслухайце і выканайце адну з беларускіх абрадавых песень, прапанаваных у электронным дадатку.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ




Велікодная паштоўка пачатку 20 стагоддзя

4. З даўніх часоў адным з атрыбутаў Вялікадня з'яўляюцца размаляваныя або фарбаваныя яйкі — *пісанкі*. Напярэдадні Светлага Хрыстовага Уваскрэсення яйкі ўпрыгожвалі рознымі спосабамі. Часцей за ўсё іх афарбоўвалі ў чырвоны, але часам выкарыстоўвалі і іншыя колеры. Пісанкі шырока выкарыстоўваліся для гульняў, забаў, рытуалаў. У Беларусі любімай забавай дзяцей на Вялікдзень было катаць яйкі ўніз па нахіленым жолабе. Чыё яйка закоціцца далей, той і пераможца.

Прыдумайце і выканайце роспіс велікоднага яйка (пісанкі). Пастарайцеся, каб ваш малюнак быў вясёлы і дынамічны.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Раздзел 4

СПЕКТАКЛЬ ЖЫВЕ ТОЛЬКІ СЁННЯ —
НА ТВАІХ ВАЧАХ, І БОЛЬШ ГЭТА ІМГНЕННЕ
НІКОЛІ НЕ ПАЎТОРЫЦЦА.
*Юрый Стаянаў*

# ТЭАТР БАЧНЫ І НЯБАЧНЫ



Сцэна з оперы «Аіда». Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь (г. Мінск)

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

«Давайце пагуляем!» — часта чуем мы. Гуляць любяць і дзеці і дарослыя. Тэатр — гэта таксама гульня. У тое імгненне, калі ў зале згасае святло, глядач з рэальнага свету перамяшчаецца ў свет уяўны. Рэальныя месцы дзеяння — горад, вёска, лес, дом — у тэатры ствараюцца наноў. Глядач з радасцю верыць у гэты ўяўны свет. Вядома, ён разумее, што лес на сцэне несапраўдны, а дом не мае падмурка… Але ўсё гэта ў час спектакля забываецца. Ахвотна прымаючы ўмовы гульні, глядач пражывае разам з героямі цэлае жыццё!

## § 12. ПАХОДЖАННЕ ТЭАТРА

Тэатралізаваныя дзеі з глыбокай старажытнасці з'яўляюцца неад'емнай часткай культуры чалавецтва. У многіх культурах свету існуюць элементы гульні. Рытуалы, пышныя святы і ўрачыстасці, рэлігійныя абрады — усюды прысутнічаюць пераўвасабленне і тэатралізацыя.

***Вытокі тэатра.*** Як самастойны від мастацтва тэатр зарадзіўся ў Старажытнай Грэцыі. Свой пачатак ён вядзе ад народных гулянняў у гонар вясёлага бога Дыяні́са. Дыяніс — апякун раслиннасці, урадлівасці, вінаградарства і вінаробства. Вясной, калі расцвіталі сады, жыхары гарадоў Старажытнай Грэцыі выходзілі ўслаўляць Дыяніса і прасілі яго падарыць новы багаты ўраджай. Свята атрымала назву «Вялікія Дыянісіі».

У час святкавання моладзь прыгожа апраналася, ладзіла шэсці, спявала ў гонар Дыяніса хвалебныя песні — *дыфіра́мбы*. З урачыстай часткі свята вылучылася *трагéдыя*, з вясёлай — *камéдыя*. Менавіта ў тыя далёкія часы нарадзіліся асноўныя тэатральныя жанры.

Найбольш папулярнымі сюжэтамі ў старажытнагрэчаскім тэатры былі *міфы*. Такія персанажы антычнага тэатра, як Дыяніс, Геракл, Праметэй, добра вядомыя і ў сучасным тэатры. З цягам часу сюжэты ўскладняліся і ў цэнтры апавядання з'явілася жыццё асобнага чалавека, яго эмоцыі і пачуцці.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Адноўлены тэатр
(г. Эпідаўр, Грэцыя)

***Як быў уладкаваны тэатр?*** Старажытнагрэчаскі тэатр будаваўся на адкрытай пляцоўцы, меў вялікія памеры і змяшчаў велізарную колькасць гледачоў.

Круглая пляцоўка, на якой выступалі хор і акцёры, атрымала назву *архе́стра*. Ззаду архестры ўстанаўлівалі палатку — *ске́ну*, у якой пераапраналіся выканаўцы. Пазней на месцы палаткі пачалі будаваць каменнае памяшканне, аформленае ў выглядзе храма або палаца. Перад скенай рабілі памост — *праске́ній.* На ім адбываліся самыя важныя падзеі. Здаралася, што ў час прадстаўлення персанажы «прылятали» з-за скены ці раптоўна з'яўляліся з «падземнага свету». Грэкі любілі тэатральныя эфекты.

***Знешні воблік акцёра.*** Акцёры антычнага тэатра карысталіся вялікай пашанай і займалі высокае становішча ў грамадстве.

Вялікія памеры тэатра абумовілі некаторыя асаблівасці касцюмаў персанажаў. Для таго каб іх можна было разгледзець здалёк, акцёры надзявалі вялікія маскі. Кожная маска адлюстроўвала пэўны эмацыянальны стан чалавека: радасць, жах, засмучэнне... Змяняўся сюжэт, змяняўся стан героя спектакля — змяняліся і маскі.



Акцёры з маскамі.
Роспіс вазы



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Яны былі настолькі вялікія, што часта скажалі прапорцыі цела выканаўцы. Для таго каб фігура выглядала прапарцыянальнай, акцёры падаўжалі адзенне, а на ногі апраналі спецыяльны абутак на высокай платформе — *кату́рны*. Фігура на катурнах выглядала больш высокай і значнай.

Колькасць акцёраў, якія ўдзельнічалі ў тэатральнай пастаноўцы, не перавышала трох. Таму кожны з іх выконваў па некалькі роляў. У жаночых ролях заўсёды былі занятыя мужчыны. Пры гэтым усе яны павінны былі добра валодаць акцёрскім майстэрствам — дэкламаваць вершы, спяваць і танцаваць. Ужо з часоў антычнасці да выканаўцаў прад'яўляліся высокія патрабаванні, таму акцёрам неабходна было шмат працаваць над сабой.

Старажытнагрэчаскі тэатр стаў пачаткам нараджэння тэатра як віду мастацтва. З тых часоў шмат што змянілася, але глядач па-ранейшаму спяшаецца на спектакль — пажурыцца і парадавацца разам з героямі, стаць удзельнікам відовішча.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах азначэнне старажытнагрэчаскіх слоў «архестра», «скена». Параўнайце іх са значэннем сучасных слоў «аркестр» і «сцэна». У чым іх адрозненне?

2. Некаторыя элементы антычнага тэатра, напрыклад *амфітэатр*, можна ўбачыць у відовішчных збудаваннях і сёння. Выканайце невялікае даследаванне: даведайцеся, што гэта такое, і прывядзіце некалькі прыкладаў сучасных амфітэатраў. Апішыце іх форму і прызначэнне, прыводзячы прыклады з электроннага дадатку. Якія амфітэатры Беларусі вы наведвалі?

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Адным з асноўных сродкаў выразнасці для перадачы эмацыянальнага стану персанажа (гнеў, радасць, гора) у старажытнагрэчаскім тэатры з'яўлялася маска (некалькі прыкладаў масак прапануюцца ў электронным дадатку). У сучасным тэатры для перадачы рознага настрою героя выкарыстоўваецца міміка акцёра.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Выканайце ў групах эскіз маскі персанажа. Першая група паспрабуе стварыць маску для камедыйнага героя, другая — для трагедыйнага. Параўнайце атрыманыя маскі. Па якіх дэталях вы вызначылі іх вобраз?

## § 13–15. ВУЧЫМСЯ РАЗУМЕЦЬ ТЭАТРАЛЬНАЕ МАСТАЦТВА

Тэатр, як і ўсе віды мастацтва, валодае ўласнымі сродкамі мастацкай выразнасці. З іх дапамогай аўтары тэатральнага твора ўздзейнічаюць на гледача, выклікаюць у яго рэакцыю ў адказ.

Самы папулярны від тэатральнага мастацтва — драматычны тэатр. Творы для драматычнага тэатра — *п’есы* — маюць асаблівую форму. У п’есе шмат дзеяння. Гэта азначае, што сюжэт развіваецца не праз апісанне таго, што адбываецца, як, напрыклад, у апавяданні, а праз падзеі і ўчынкі дзейных асоб. Аўтарам п’есы з’яўляецца драматург.

**П’е́са** — літаратурны твор для пастаноўкі на сцэне.

**Дзе́янне** — чарада падзей, заснаваных на сутыкненні інтарэсаў.



Сцэна са спектакля «Несцерка». Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа (г. Віцебск, Беларусь)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

***Як працуе драматург?*** Пасля назвы п'есы драматург пазначае жанр твора (напрыклад, драма, трагедыя, камедыя, трагікамедыя) і прапануе спіс персанажаў — дзейных асоб.

**Рэ́пліка** — з фр. «адказ».
**Рэма́рка** — з фр. «пазнака».

Часам побач з імёнамі герояў ён указвае іх характарыстыкі: узрост, становішча ў грамадстве, асаблівасці знешняга выгляду.

Асноўны тэкст п'есы складаецца з *рэплік* герояў. Як правіла, гэта дыялог некалькіх персанажаў. Часта ў п'есе сустракаюцца спецыяльныя тлумачэнні — *рэмаркі*, у якіх драматург апісвае месца дзеяння або характар паводзін і настрой герояў.

**НЕСЦЕРКА**

**Камедыя ў трох дзеях, сямі карцінах**

**Дзейныя асобы:**
Несцерка. Юрась.
Мацей — ганчар. Насця — дачка Мацея.
Мальвіна — жонка Мацея (і г. д.).

**Дзея першая**

**Карціна першая. Кірмаш**

*Збоку, з-за куліс, аглядаючыся, выбягае на авансцэну перад заслонай Несцерка. Убачыў публіку ў зале, спыніўся. Кланяецца.*

Несцерка *(перад заслонай, да публікі)*. Добры вечар, сябры! Эге, колькі вас тут сабралася! Не раўнуючы, як дроў у лесе. Але ж ці няма сярод вас і тых дурняў, што за мною гоняцца? *(Углядаецца ў залу.)* Здаецца, няма... Вядома, у страху вочы вялікія. Апёкся на малацэ, дык і на халодную ваду дзьмуць будзеш...

*Віталь Вольскі*



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

***Героі п'есы.*** Галоўны герой п'есы — Несцерка. Яго можна назваць народным філосафам. Здзяйсняючы розныя ўчынкі, нават самыя авантурныя, ён заўсёды імкнецца іх растлумачыць. У словах героя выяўляецца мудрасць народа. Назіраць за ўчынкамі Несцеркі на сцэне не толькі цікава, але і павучальна: вясёлы і бесклапотны, ён заўсёды знаходзіць выйсце са складанага становішча, дапамагае іншым і атрымлівае за гэта ўзнагароду. Прастата, адкрытасць і эмацыянальнасць Несцеркі адчуваюцца ўжо ў першых яго рэпліках. Пры дапамозе рэмарак — «лагодна», «рашуча», «задумаўся» — драматург падкрэслівае разважлівасць і кемлівасць галоўнага героя.

Літаратурны тэкст на мову сцэны «перакладаюць» *рэжысёр*, *мастак*, *кампазітар*, *харэограф* і *акцёры*. Яны ствараюць свет спектакля, раскрываюць галоўную ідэю тэатральнага твора.

***Як працуе рэжысёр спектакля?*** Адзін з галоўных стваральнікаў сцэнічнага твора — рэжысёр. Асноўны сродак выразнасці ў рэжысёра — *мізансцэна*. Мізансцэны пастаянна змяняюць адна адну ў пэўным рытме. Рэжысёр спектакля «Несцерка» выбудоўвае свет глыбокіх чалавечых адносін з дапамогай масавых сцэн. У іх, на думку рэжысёра, асабліва яскрава выяўляюцца характары і ўзаемаадносіны герояў.

**Мізансцэ́на** — размяшчэнне акцёраў у сцэнічнай прасторы.



Сцэна са спектакля «Несцерка». Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа (г. Віцебск, Беларусь)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

***Роля тэатральнага мастака.*** Адначасова з рэжысёрам над пастаноўкай працуе мастак. Асноўныя сродкі выразнасці, якія ён выкарыстоўвае, — дэкарацыі і касцюмы.

*Дэкарацыі* ў спектаклі «Несцерка» падкрэсліваюць святочную атмасферу. Падзеі адбываюцца ў прасторы, абрамленай драўлянымі аркамі, упрыгожанымі багатай разьбой, тканымі пакрываламі, трыма радамі вясельных ручнікоў. Дэкарацыя з квітнеючай яблыняй сімвалізуе пяшчоту і юнацкасць галоўнай гераіні. Дзякуючы падсветцы дрэва і кветкі глядзяцца на сінім фоне як жывыя.

**Дэкара́цыя** — вобраз прасторы, у якой адбываюцца падзеі.

*Сцэнічны касцюм* расказвае гледачу пра характар і настрой дзейных асоб. Яркія, выразныя касцюмы герояў спектакля «Несцерка» характарызуюць эпоху і даюць пэўнае ўяўленне пра персанажаў-беларусаў. Шляхецкая вопратка са слуцкімі паясамі арганічна спалучаецца з народнымі строямі. Асабліва ўражвае багацце ўнікальных колеравых і арнаментальных малюнкаў у жаночых касцюмах.

***Акцёр у тэатры.*** Не менш важная асоба ў тэатры — акцёр. Жывое выкананне вылучае тэатр сярод іншых відаў мастацтва. Кожны акцёр стварае сцэнічны вобраз — *іграе ролю*, гэта значыць адлюстроўвае на сцэне героя п’есы, паказвае яго пачуцці і эмоцыі. Для стварэння сцэнічнага вобраза акцёр выкарыстоўвае ўласныя сродкі выразнасці: *слова, тэмбр голасу, інтанацыі, рухі, жэсты* і *міміку*.

**Акцёр** — з грэч. «той, хто дзейнічае».

**Мі́міка** — выраз на твары розных эмоцый.

***Музычнае рашэнне спектакля.*** Найважнейшым выразным сродкам спектакля таксама з’яўляецца музыка. З яе дапамогай аўтары пастаноўкі настройваюць гледача на эмацыянальную хвалю спектакля — вясёлую, лірычную або сумную. Музыка падкрэслівае рытм пастаноўкі, раскрывае душэўны стан герояў.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Кампазітар спектакля «Несцерка» часта звяртаецца да народных мелодый. Напрыклад, у сцэне вяселля гучыць мелодыя беларускай народнай песні «Ляцелі гусанькі цераз сад», у фінале — гукі «Лявоніхі», а з'яўленне на сцэне аднаго з герояў суправаджаецца гукамі мазуркі.

***Спецэфекты на тэатральнай сцэне.*** Сучасныя спектаклі часта ўражваюць незвычайнасцю. Артысты нечакана выходзяць на сцэну з глядзельнай залы. Героі, якія ўвасабляюць чарадзейныя сілы, б'юцца з ворагам так высока, што даводзіцца глядзець уверх. Прадметы ў прасторы сцэны настолькі павялічаны, што міжволі забываеш пра тое, дзе знаходзішся. А галоўны герой пастаноўкі раптам праходзіць па столі дагары нагамі.

Дзякуючы новым тэхналогіям з'яўляюцца ўнікальныя дэкарацыі і касцюмы. Напрыклад, басейн на сцэне, сцэна ў форме самалёта ці сукенка гераіні, падол якой з цяжкасцю ўтрымліваюць у руках усе дзейныя асобы спектакля.

Для дасягнення эфекту відовішчнасці выкарыстоўваюцца і мультымедыйныя сродкі выразнасці. Гэта разнастайныя светлавыя і гукавыя эфекты. Напрыклад, ілюзія конніцы, якая праносіцца скрозь залу, або цягніка, які набліжаецца здалёк. Часткай дэкарацый робяцца фотаздымкі, кінамалюнкі, відэапраекцыі, камп'ютарная графіка, анімацыя.



Сцэна са спектакля «Чаму старэюць людзі?» (рэжысёр Аляксей Ляляўскі, мастак Таццяна Нерсісян). Беларускі дзяржаўны тэатр лялек (г. Мінск)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Тэатр — сінтэтычны від мастацтва. Яркія сцэнічныя вобразы ствараюцца дзякуючы злучэнню выразных сродкаў літаратуры, выяўленчага мастацтва, музыкі, харэаграфіі і магчымасцей мультымедыя.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Патлумачце, як вы разумееце выраз «ужывацца ў ролю».



Сцэна са спектакля «Любоў да трох апельсінаў». Маскоўскі дзяржаўны акадэмічны музычны дзіцячы тэатр імя Н. І. Сац (Расія)

2. Якія тэатральныя пастаноўкі ці відэаспектаклі вы паглядзелі сёлета? Які спектакль вам спадабаўся найбольш? Чаму? Ахарактарызуйце скарыстаныя ў ім сродкі выразнасці тэатральнага мастацтва.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Сучасныя тэхнічныя магчымасці дапамагаюць ператварыць тэатральную пастаноўку ў маленькі цуд… Прыдумайце такое «дзіва» самастойна. Выберыце любое цікавае апавяданне, байку, верш. Змясціце герояў у незвычайныя ўмовы. Прыдумайце для іх унікальную прастору, у якой будуць знаходзіцца нязвычныя рэчы, выдуманыя вамі прадметы, адзенне, посуд… Фантазіруйце! Здзіўляйце!

## § 16. ТВОРЧЫ ЎРОК: «АЖЫЛЫЯ КАРЦІНЫ»

Узаемасувязь тэатральнага і выяўленчага мастацтва стала асновай для стварэння прадстаўленняў у выглядзе «ажылых карцін».

Акцёр або група акцёраў у час такога паказу прымаюць пэўныя скульптурныя позы, актыўна выкарыстоўваючы пры гэтым выразную міміку, выверaныя жэсты, гульню святла. Для «ажылых карцін» спецыяльна ствараюцца дэкарацыі, падбіраюцца касцюмы. Гэтыя сродкі выразнасці выкарыстоўваюцца для ўвасаблення ўнутранага стану дзейных асоб.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Назавіце карціны, якія звязаны з Новым годам.

Выберыце тую карціну, у якой ёсць сюжэт.

Вывучыце твор.

Перакажыце сюжэт карціны выразна, з патрэбнай інтанацыяй.

Прадумайце і абмяркуйце ў групах, якія касцюмы, прадметы і фон неабходныя для ператварэння выбранага твора ў «ажылую карціну».

Размяркуйце ролі.

Старанна прадумайце, як прадэманстраваць характар герояў вашай карціны.

Падбярыце музычнае ці літаратурнае суправаджэнне.

Адрэпеціруйце мізансцэну — размяшчэнне і ўзаемадзеянне персанажаў у прасторы і часе.

Правядзіце музычна-літаратурны вечар «Ажылыя карціны».

Ці пазналі вашы госці творы мастацтва?

**«Ажылыя карціны»** ствараюць людзі, якія ў сваіх позах увасабляюць вядомыя мастацкія карціны ці сюжэт.



Карціна Філіпа Маля́віна «Дзяўчына, якая смяецца»



Работа вучняў сярэдняй школы № 1 в. Копішча Мінскага раёна (Беларусь)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Часцей за ўсё ў «ажылых карцінах» выкарыстоўваліся гістарычныя сюжэты. Удзельнікі імкнуліся адлюстраваць асаблівасці эпохі і каларыт месца дзеяння. Гледачы прысутнічалі ў той жа прасторы, дзе знаходзілася такая «карціна»: улоўлівалі атмасферу і дух часу, у якім жылі персанажы.

## § 17. ЯК УЛАДКАВАНЫ СУЧАСНЫ ТЭАТР?

Будынак тэатра прыкметны здалёк. Яго ўпрыгожваюць калоны, арыгінальныя фігуры і дэталі. Часта такія будынкі маюць незвычайную форму. Усё гэта невыпадкова: прыходзячы ў тэатр, глядач павінен забыцца пра штодзённыя клопаты, апынуцца ў атмасферы свята.

***Глядзельная зала і сцэна.*** Уздзеянне на эмацыянальны стан гледача працягваецца ў глядзельнай зале. З любога яе месца адкрываецца від на сцэну. Існуюць розныя тыпы сцэны і спосабы размяшчэння гледачоў. Сцэна, якая з трох бакоў абмежавана сценамі і размяшчаецца перад глядзельнай залай у форме партэра з ярусамі, называецца *сцэнай-каробкай*. Сцэна, з трох або чатырох бакоў абкружаная амфітэатрам з глядацкімі месцамі, — *сцэнай-арэнай*.

**Партэ́р** — з фр. «на зямлі». Ніжні паверх глядзельнай залы.


Сцэна-каробка.
Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (г. Мінск, Беларусь)



Сцэна-арэна.
Летні амфітэатр
(г. Віцебск, Беларусь)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

***Таямнічы свет закулісся.*** У закуліснай частцы тэатра, якую глядач не бачыць, размяшчаюцца творчыя цэхі. У іх працуюць людзі самых розных прафесій. Менавіта тут, у закуліссі, нараджаюцца спектаклі, якія потым радуюць і захапляюць гледачоў.

***Зазірнём у дэкарацыйны цэх...*** Вобраз будучай пастаноўкі ствараецца паэтапна. Спачатку мастак малюе эскізы дэкарацый і робіць макет да спектакля. Гэта неабходна для таго, каб удзельнікі спектакля маглі загадзя ўявіць, як будуць выглядаць усе элементы афармлення ў прасторы сцэны. У натуральную велічыню дэкарацыі выконваюць у дэкарацыйным цэху.



Праца над макетам да спектакля. Народны мастак Беларусі, лаўрэат дзяржаўных прэмій СССР і Беларусі Барыс Герлаван

**Эскі́з** — папярэдні накід ідэі.

**Маке́т** — паменшаная ў шмат разоў выява сцэнічнай прасторы.

***Што знаходзіцца ў бутафорскім і рэквізітарскім цэхах?*** Для многіх спектакляў вырабляюць *бутафо́рыю* — несапраўдныя прадметы, якія маюць знешняе падабенства з арыгінальнымі. Старадаўнія кароны і кубкі, чарніліцы з пёрамі і зброю ствараюць у бутафорскім цэху. Бутафорскія прадметы дапамагаюць аўтару спектакля больш ярка паказаць эпоху і характар герояў, а акцёрам — раскрыць абстаноўку.



У бутафорскім цэху. Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр

У спектаклі «Пінская шляхта» драматурга Вінцэнта Ду́ніна-Марцінке́віча можна заўважыць велізарную бутафорскую залатую пячатку ў выглядзе двухгаловага арла. Яе памеры і форма падкрэсліваюць



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

веліч суддзі — галоўнага героя п'есы. А яго машынка для рэзкі паперы настолькі вялікая, што сваім грозным выглядам выклікае страх. Для стварэння патрэбнага фону і атмасферы на сцэне таксама выкарыстоўваецца *рэквізіт* — дробныя прадметы інтэр'ера і побыту. Мэбля, посуд, упрыгажэнні, аксесуары знаходзяцца ў распараджэнні рэквізітарскага цэха.

Тэатральныя бутафоры і рэквізітары — умельцы, майстры на ўсе рукі! Яны ствараюць, а затым беражліва захоўваюць прадметы з асаблівымі ўласцівасцямі. Напрыклад, зброя павінна быць бяспечнай, а ваза, якая разбіваецца ў кожным спектаклі, павінна лёгка «збірацца» наноў.

***Загадкі пашывачнага, касцюмернага і грымёрнага цэхаў.*** Касцюмы дзейных асоб выконваюць на аснове эскіза мастака. Яго задума ўвасабляецца ў *пашывачным цэху*. Касцюмы розных гістарычных эпох ствараюцца з разнастайных матэрыялаў: тканіны, поліэтылену, паперы... Старадаўнія сукенкі з раскошнымі дэкаратыўнымі элементамі ці шыкоўныя, вышываныя залатымі ніткамі кафтаны і сурдуты — усё падуладна майстрыхам пашывачнага цэха. Захоўваюць зробленыя касцюмы, галаўныя ўборы, абутак і даглядаюць іх у *касцюмерным цэху*.



Сцэна са спектакля «Віні-Пух і ўсе-ўсе-ўсе...». Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь (г. Мінск)

Завяршальныя штрыхі да вобраза акцёра дадае грымёр. У *грымёрным цэху* выканаўцам наносяць грым. Пры неабходнасці выкарыстоўваюць парыкі, вусы, бароды, локаны. Сцэнічнае аблічча дзейных асоб павінна быць яркім, выразным і дакладным.

***Светлавая палітра спектакля.*** Для атрымання разнастайных сцэнічных эфектаў сцэна абсталявана спецыяльнымі асвятляльнымі прыборамі — разнастайнымі



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Сцэна са спектакля «На маёй планеце». Беларускі дзяржаўны тэатр лялек (г. Мінск)

пражэктарамі з каляровымі фільтрамі, праекцыйнымі ўстаноўкамі… Мастакі па святле прыдумваюць светлавы вобраз спектакля, а асвятляльнікі малююць светлавую партытуру ў час пастаноўкі. Ім падуладныя яркае святло дня ці вячэрні змрок, казачныя адценні марскога дна і блісканне маланак на сцэне.

***Рэпетыцыя ў тэатры: хто галоўны?*** Свой нябачны бок стварэння сцэнічнага вобраза існуе і ў акцёраў. У спецыяльных *рэпетыцыйных залах* праходзіць складаная карпатлівая праца. Пад кіраўніцтвам рэжысёра акцёры рэпеціруюць свае ролі. Для таго каб «пражываць» на сцэне розныя лёсы, патрабуецца вялікая творчая самааддача. Акцёраў, якія здолелі стварыць незабыўныя ролі, называюць вялікімі.

Кожны новы спектакль і новы сцэнічны вобраз нараджаюцца толькі ў прысутнасці нас, гледачоў. Мы ўважліва назіраем за падзеямі і перажываем за лёсы герояў. І ствараем свае вобразы. Толькі пры актыўным удзеле гледачоў развіваецца тэатральнае мастацтва.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. «Тэатр пачынаецца з вешалкі!» — гэту фразу часта паўтараюць сапраўдныя тэатралы. Паразважайце пра тое, што яна азначае.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

2. У сучасным тэатры магчымасці сцэны амаль неабмежаваныя. Паглядзіце на афіцыйным сайце Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі (bolshoibelarus.by) відэаролік «Магчымасці сцэны». Пералічыце гэтыя магчымасці. Дасягненню якога эфекту яны садзейнічаюць?

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Разгледзьце элементы сучаснага тэатра ў электронным дадатку. Якую ролю выконвае частка сцэнічнай прасторы, што называецца *фае*? Яшчэ да пачатку спектакля глядач трапляе ў святочную атмасферу. Падумайце, а як бы вы арганізавалі фае школьнага тэатра, каб вашым гасцям было ўтульна і камфортна? З дапамогай якіх атрыбутаў можна заінтрыгаваць гледачоў? Якія «падказкі» можна прапанаваць вашым гасцям, каб настроіць іх на сустрэчу з тэатрам?

## § 18. ТЭАТР ЛЯЛЕК

Лялькі, якія ўяўляюць сабой багоў і падобных да чалавека істот, вядомыя з глыбокай старажытнасці. Спачатку такія лялькі знаходзіліся ў храмах, іх ушаноўвалі ў час традыцыйных рытуальных дзей. З часам лялечныя спектаклі зрабіліся самастойным відовішчам.


Лялька Палішынель (Францыя)

***Першыя тэатральныя лялькі.*** У розных краінах былі свае любімцы — героі лялечных прадстаўленняў. Пульчынела — у Італіі, Палішынéль — у Францыі, Пятрушка — у Расіі. Гэтыя героі не толькі смяшылі і весялілі гледачоў, але і перамагалі ворагаў, каралі зло і сцвярджалі справядлівасць. Да таго ж яны не былі ідэальныя — сваволілі і гарэзнічалі. А калі ўлічыць, што ў межах прадстаўленняў персанажы часцяком паведамлялі самыя свежыя навіны, вулічныя лялечныя спектаклі можна назваць своеасаблівымі «жывымі сайтамі навін».



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Што незвычайнае ў лялечных спектаклях? П’ес, напісаных для пастаноўкі на сцэне тэатра лялек, няшмат. Таму стваральнікі спектакляў выкарыстоўваюць гісторыі, прыдуманыя пісьменнікамі-казачнікамі.

Сюжэты пра дзіўныя прыгоды ці падзеі, якія складана ўявіць ці прадэманстраваць у драматычным спектаклі, з лёгкасцю можна паказаць у тэатры лялек. Напрыклад, эпізод, дзе галоўныя героі казкі пра Чырвоную Шапачку знаходзяцца ў чэраве Ваўка, вырас усяго з некалькіх радкоў.

Воўк быў спрытнейшы, ён скокнуў на дзяўчынку і праглынуў яе разам з шапачкай... На шчасце, акурат у гэты момант дрывасекі вярталіся з лесу пасля працы і праходзілі паўз бабуліну хатку. Пачулі шум і ўварваліся ў хатку, расправіліся з Ваўком і вызвалілі Бабулю і Чырвоную Шапачку.

*Шарль Пэро.*
*Казка «Чырвоная Шапачка»*

Волк. А-ха-ха! Наконец-то! Молодец! Съел! Победил!

Красная Шапочка. А кто здесь ещё у волка в животе?

Бабушка. Кто же, как не бабушка!

Красная Шапочка. Он и тебя съел? Ты, бабушка, не бойся, — мы спасёмся.

Бабушка. Учи меня... Будто я не знаю.

Волк. Тише вы там! Не мешайте мне спать!

Бабушка. Отстань! Что это? Он тебя с корзинкой проглотил? Дай-ка мне кусочек пирога. Спасибо. Внучка! Да ты, никак, плачешь?

Красная Шапочка. Это я не от страху, бабушка, а мне обидно, что он меня перехитрил.

<...>

Бабушка. Красная Шапочка, ты на меня не сердишься?

Красная Шапочка. За что?

Бабушка. Я компресс сняла. Уж очень тут жарко.

Красная Шапочка. Давай я завяжу. Сейчас же. Нас очень скоро спасут, а ты простудишься.

*Яўгеній Шварц. П’еса «Чырвоная Шапачка»*



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Драматург Яўгеній Шварц зацікавіўся, здавалася б, наіўным, але цалкам слушным пытаннем: а што ж рабілі гераіні да таго, як іх выратавалі? І напісаў у п'есе па матывах казкі цудоўную сцэну дыялогу Бабулі, Чырвонай Шапачкі і... Ваўка. Бо гэты злосны герой нікуды не знікае з дзеяння, менавіта ў ім знаходзяцца гераіні! Нядзіўна, што ён становіцца актыўным удзельнікам дыялогу.



Лялькі-марыянеткі са спектакля «Гукі музыкі». Зальцбургскі тэатр марыянетак (Аўстрыя)

***Хто кіруе лялькамі?*** Адрозніваюць некалькі відаў лялек: *марыянеткі, пальчаткавыя, трысцінавыя, батлеечныя*... Як правіла, акцёр, які кіруе такімі лялькамі, альбо знаходзіцца за шырмай, альбо апранаецца ў чорны касцюм для таго, каб быць «нябачным». Таму акцёр можа выконваць любую ролю, незалежна ад узросту і полу персанажа.

Лялькі ў традыцыйным японскім лялечным тэатры «Бунра́ку» вялікія, амаль у рост чалавека, з размаляванымі фарфоравымі галоўкамі. Кожную ляльку вядуць некалькі акцёраў: галоўны ляльквод прыгожа апрануты, бачны публіцы і кіруе рукой і галавой персанажа. Яго памочнікі-акцёры апрануты



Сцэна з лялечнага прадстаўлення «Бунраку» (Японія)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

ў чорныя мантыі і капюшоны. Адзін з іх кіруе тулавам лялькі, другі — нагамі. Акцёры на сцэне не гавораць — слоўную частку спектакля выконвае пад музычны акампанемент апавядальнік, які сядзіць збоку.

У сучасным тэатры лялек можна ўбачыць спектаклі, дзе акцёры ствараюць сцэнічныя вобразы нароўні з персанажамі-лялькамі. Выконваць ролю можа ценявая лялька, маска, скульптура, любы прадмет побыту ці нават звычайная палоска святла…

Асаблівую паэтычнасць прадстаўленню надаюць ценявыя лялькі. Яны заварожваюць гледача. Напрыклад, у спектаклі «Дзіўны цырк Марка Шагала» ўдзельнічаюць больш за 70 (!) такіх лялек. З іх дапамогай на экране, нібы на белым палатне, узнікаюць персанажы-вобразы, увасобленыя на палотнах знакамітага мастака.



Ценявыя лялькі са спектакля «Дзіўны цырк Марка Шагала». Маскоўскі тэатр лялек, ценяў і акцёра «Адлюстраванне» (Расія)

У спектаклі «Чаму старэюць людзі?» лялька галоўнага ліхадзея Цмока — анімацыйны персанаж. Глядач бачыць мультымедыйную праекцыю — вялізныя зубы і вочы



Сцэна са спектакля «Чаму старэюць людзі?». Беларускі дзяржаўны тэатр лялек (г. Мінск)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

пачвары. З дапамогай такога буйнога плана аўтары ўзмацняюць уражанне ад яго супрацьстаяння са смелым маленькім Рыгоркам. Хлопчык не пабаяўся выступіць супраць зла, каб вярнуць маладосць людзям.

Традыцыі тэатра лялек складваліся тысячагоддзямі. Лялькі карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Іх ствараюць з любых прадметаў або з дапамогай мультымедыйнай праекцыі; у сучасных спектаклях побач з лялькамі іграюць акцёры без масак і лялек.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Французская лялька Палішынель з’явілася на сцэне кірмашовага тэатра. Вялізныя вочы Палішынеля выглядаюць то гарэзнымі, то сярдзітымі, то ўсмешлівымі, то абуранымі — у залежнасці ад таго, як павярнуць ляльку да публікі.

З гэтым героем звязаны вядомы выраз «сакрэт Палішынеля». Даведайцеся ў інфармацыйных крыніцах, што ён азначае. Да каго з сучасных казачных герояў вы дастасавалі б гэты выраз?

2. У лялечных прадстаўленнях нескладана ўвасобіць самых незвычайных персанажаў. Напрыклад, Гаворачую Лужыну, Шкарпэтку, Высокую Тэмпературу. Або герояў з імёнамі Што-небудзь ці Ніхто. Прыдумайце незвычайных персанажаў для лялечнага спектакля. Якое імя героя вы выберыце? Якія сюжэты з прыдуманымі героямі вам было б цікава ўбачыць? Які знешні выгляд будзе ў лялькі такога персанажа? Прыдумайце займальную гісторыю пра гэтых герояў.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Прачытайце ў параграфе фрагмент п’есы «Чырвоная Шапачка» Яўгенія Шварца. Што вас здзівіла? Чаму? Што, на вашу думку, адчуваюць гераіні, знаходзячыся ў такім незвычайным месцы? Як вы сабе ўяўляеце гэту прастору? З якіх падручных сродкаў (крэслаў, тканіны, паперы, цэлафану) вы змайстравалі б такое месца дзеяння? Як выглядалі б лялькі Бабулі і Чырвонай Шапачкі, Ваўка?

Выканайце ў створанай прасторы сцэну з п’есы. Якія пачуцці вы зведалі, калі разыгрывалі эпізод?



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

# § 19. МУЗЫЧНЫ ТЭАТР: ОПЕРА І БАЛЕТ

Музычны тэатр — яшчэ адзін від тэатральнага мастацтва. Яго найбольш пашыранымі жанрамі з'яўляюцца *опера* і *балет.*

***Асновы музычнага спектакля.*** Галоўным сродкам выразнасці ў музычным тэатры выступае *музыка*. Менавіта музыка «кіруе» дзеяннямі герояў, дапамагае выразна перадаць настрой і характар персанажаў. Таму пры стварэнні спектакля ў музычным тэатры асабліва вылучаецца роля *кампазітара*. Ён выбірае літаратурны твор, сюжэт якога стане асновай музычнага спектакля, і нярэдка сам піша *лібрэта* да будучай пастаноўкі. Невыпадкова кампазітара ў музычным тэатры называюць *музычным драматургам*. На аснове лібрэта кампазітар стварае *партыту́ру* спектакля — нотны запіс музычна-драматычнага твора.

**Лібрэ́та** — з іт. «кніжачка». Літаратурная аснова оперы і балета.

***Што такое опера?*** У тэатры оперы акцёры разыгрываюць партытуру з дапамогай вакальнага мастацтва. Гэта значыць, акцёры не гавораць, а спяваюць вакальныя нумары. У іх выканаўцы выказваюць пачуцці і эмоцыі герояў, а таксама іх узаемаадносіны.

**Опера** — гэта «драма, напісаная музыкай».
*Барыс Пакроўскі*

Сольныя вакальныя нумары ў оперы называюцца па-рознаму: *арыя*, *арыёза*, *песня*... Усе яны адрозніваюцца па форме і характары выканання, але падобныя ў галоўным — гэта вакальныя творы для аднаго голасу з акампанементам. Майстэрства кампазітара заключаецца ў тым, каб у адным кароткім нумары паказаць усю глыбіню стану персанажа.

У оперы «Снягурка» кампазітара Мікалая Ры́мскага-Ко́рсакава вобраз пяшчотнай, паэтычнай Снягуркі выяўляецца ўжо ў самым пачатку — у арыі «З сяброўкамі па ягады хадзіць». Лёгкія, чароўныя музычныя інтанацыі Снягуркі напоўнены свежасцю і



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Сцэна з оперы «Снягурка». Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь (г. Мінск)

цеплынёй. Высокі голас дзяўчыны — сапрана — пераклікаецца з напевамі флейты, якая падкрэслівае вытанчанасць вобраза галоўнай гераіні.

Дыялог некалькіх оперных персанажаў — гэта вакальны ансамбль. Сваю назву ансамбль атрымлівае ў залежнасці ад колькасці «суразмоўцаў». Вакальны твор для двух герояў называецца дуэт, для трох — трыа, чатырох — квартэт. У адрозненне ад дыялогу ў драматычным спектаклі, героі опернага вакальнага ансамбля, выказваючы свае думкі і пачуцці, могуць спяваць разам, адначасова.

***У свеце балета.*** У тэатры балета музычная партытура ўвасабляецца з дапамогай мастацтва *харэаграфіі*. Усе падзеі і дзеянні герояў, апісаныя ў лібрэта, «распавядаюцца» з дапамогай рухаў. Асноўныя аўтары балета — *харэограф* і *балетмайстар.* Харэограф прыдумвае танец, а балетмайстар выбудоўвае харэаграфічныя нумары ў адпаведнасці з сюжэтам і музыкай, створанай кампазітарам. У балеце музыка і харэаграфія роўныя!

**Харэагра́фія** — мастацтва сцэнічнай пастаноўкі і выканання танца.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Сцэна з балета «Папялушка».
Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета
Рэспублікі Беларусь (г. Мінск)

Танцавальныя нумары ў балеце, як і вакальныя нумары ў оперы, маюць свае назвы. Напрыклад, танец двух выканаўцаў называецца французскім словам *па-дэ-дэ*, трох — *па-дэ-труа*. Артысты, якія выконваюць масавыя танцавальныя нумары, — гэта артысты *кардэбалету.*

У балеце харэаграфічнае мастацтва злучаецца з акцёрскім майстэрствам. Асабліва гэта праяўляецца ў сучасных балетных спектаклях.

Напрыклад, у балеце «Папялушка» кампазітара Сяргея Пракоф'ева дзеянне перанесена ў пачатак 20 стагоддзя. Сёстры галоўнай гераіні — Злюка і Крыўляка — грубыя і жорсткія. Выхаванкі балетнай студыі, яны мараць заваяваць сэрца Прынца на танцавальным конкурсе. Іх характар ярка выяўляецца ў танцавальнай пластыцы. Падкрэслена ўтрыраваныя, манерныя рухі і выразная міміка робяць вобразы сясцёр зразумелымі без слоў.

Музычны тэатр ва ўсе часы адрозніваўся асаблівай відовішчнасцю, пышнасцю, багаццем фарбаў і маштабнасцю масавых сцэн. Арыгінальнасць і выразнасць сцэнічнага ўвасаблення музычнага



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

спектакля залежыць ад фантазіі і творчага ўяўлення *рэжысёра*. У садружнасці з мастаком ён ператварае гукавыя вобразы ў візуальныя, бачныя. А ўвасобіць задуманае дапамагаюць выканаўцы — артысты.

Тэатр — гэта мастацтва дзеяння, а музыка — мастацтва пачуццяў і эмоцый. У музычным тэатры адбываецца іх злучэнне. Дзякуючы гэтаму глядач не толькі бачыць учынкі і дзеянні герояў. Ён «чуе» іх пачуцці, выражаныя ў музычнай інтанацыі, мелодыі, рытме, рухах…

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Выкарыстоўваючы прыклады ў параграфе і электронным дадатку, назавіце галоўныя сродкі выразнасці ў оперы і балеце. Ахарактарызуйце кожны на прыкладзе фрагмента, прагледжанага вамі на ўроку, або на прыкладзе твора, з якім вы пазнаёміліся ў музычным тэатры.

2. Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах фрагменты з оперы «Снягурка» і балета «Папялушка». Апішыце вобразы абедзвюх гераінь. Якімі сродкамі выразнасці музычнага тэатра ўвасоблены вобразы гераінь? Якія дэталі падкрэсліваюць іх характар? У апісанні вобразаў абавязкова выкарыстоўвайце назвы сродкаў мастацкай выразнасці, а таксама эпітэты, якія характарызуюць вобразы гераінь.

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. На афіцыйным сайце Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі паглядзіце афішы спектакляў для дзяцей. Якія з гэтых спектакляў вы глядзелі, а якія хацелі б паглядзець? Прапануйце свае ідэі для музычных пастановак. Якія творы, на ваш погляд, можна расказаць сродкамі музычнага і харэаграфічнага спектакля? Абгрунтуйце сваё меркаванне.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Раздзел 5

У КІНО КОЖНЫ МОЖА ПРА ШТОСЬЦІ ПАМАРЫЦЬ...

*Эрых Марыя Рэмарк*

# КІНО — ДЗЯСЯТАЯ МУЗА



Алена Турава. Першы здымачны дзень

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Свет кіно — неверагодна цікавы і займальны. Добрае кіно зачароўвае, здзіўляе, захапляе і ўражвае. Для многіх людзей прагляд любімага фільма — ні з чым не параўнальнае задавальненне. А часам і сапраўднае свята! Разам з героямі кінастужкі мы радуемся або сумуем, трапляем у разнастайныя прыгоды, робімся сведкамі адвагі і мужнасці, змагаемся за гонар і справядлівасць.

Мінулае і будучыня дзякуючы кінамастацтву ператвараюцца ў яркі зрокавы вобраз і ад гэтага робяцца больш блізкімі і зразумелымі.

## § 20. ПАХОДЖАННЕ КІНАМАСТАЦТВА

Гісторыя кіно надзвычай цікавая. Пачалася яна задоўга да афіцыйнай даты яго нараджэння. А менавіта з дзіўнай здольнасці чалавека *назіраць* за навакольным светам і жадання любым спосабам *фіксаваць* самыя дробныя рухі людзей, прадметаў і з'яў гэтага свету.



«Чароўныя ліхтары»



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

***Першыя кінаапараты.*** Самым важным вынаходствам чалавека ў гісторыі кіно стаў «чароўны ліхтар». Ён змяшчаў у сабе тэатр ценяў і складаўся са знешняй абалонкі і крыніцы святла, напрыклад лампады або электрычнай лямпы. Выявы фіксаваліся на пласцінах са шкла і нагадвалі сучасныя слайды. Калі прыгледзецца да формы «чароўнага ліхтара», можна заўважыць, што менавіта ён — папярэднік сучаснага кінапраектара.

Першы кінаапарат афіцыйна запатэнтавалі браты Люм’ер. З яго дапамогай 28 снежня 1895 года Луі і Агю́ст Люм’ер у Гранд-кафэ на бульвары Капуцынак у Парыжы прадэманстравалі свае фільмы. У гэты дзень і быў пакладзены пачатак кіно як новага віду мастацтва!

***Першыя фільмы.*** Першыя фільмы братоў Люм’ер былі кароткія — каля 50 секунд. Самым папулярным быў фільм «Паліты палівальшчык». Гэта гісторыя пра тое, як хлопчык, стоячы за спінай садоўніка, які паліваў кветкі, наступае на шланг з вадой. Хлопчык рэзка прыбірае нагу са шланга, і садоўнік нечакана аблівае сябе. Простая гісторыя, расказаная з дапамогай новых мастацкіх сродкаў, выклікала ашаламляльную цікавасць.

На кінапаказе братоў Люм’ер пабываў вядомы ілюзіяніст Жорж Мельес. Фільмы здаліся яму сумнымі і аднастайнымі. Таму ён звярнуў увагу на забаўляльны бок кіно — трукі і спецэфекты. У фантастычнай стужцы «Падарожжа на Месяц» ён выкарыстаў новыя



Кадр з фільма
«Паліты палівальшчык»
(рэжысёры Луі і Агюст Люм’ер)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Кадр з фільма «Падарожжа на Месяц» (рэжысёр Жорж Мельес)



Кадр з фільма «Малыш» (рэжысёр Чарлі Чаплін)



Кадр з фільма «Чараўнік краіны Оз» (рэжысёр Віктар Флéмінг)

прыёмы — стоп-кадр, запаволеную здымку. У сучасным кіно гэтыя эфекты звыклыя. Але многія рэжысёры вучыліся і дагэтуль вучацца ў Жоржа Мельеса, менавіта ім прыдуманыя эфекты выкарыстоўваюць у сваіх фільмах.

***Гук і колер у кіно.*** Кіно без гуку называюць *нямым*. Адным з самых знакавых у нямым кіно стаў вобраз Валацугі. Яго стварыў і сыграў вядомы рэжысёр і акцёр Ча́рлі Ча́плін. Атрымаўся надзіва кранальны і адначасова смешны герой, які імгненна стаў папулярным.

*Гук* у кіно з'явіўся толькі праз 30 гадоў пасля першага кінасеанса братоў Люм'ер.

Але асабліва цікавая гісторыя з'яўлення ў кіно *колеру*. У першых каляровых фільмах плёнку размалёўвалі ўручную. Амерыканскі фільм-



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

казка «Чараўнік краіны Оз» пачынаецца з чорна-белых кадраў. Затым нечакана выява становіцца каляровай. Гэта зроблена для ўзмацнення эфекту кантрасту паміж рэальным светам, дзе нарадзілася дзяўчынка Элі, і светам фантастычным, куды яна нечакана трапляе.

Гісторыя кіно — гэта гісторыя арыгінальных ідэй, вынаходстваў і тэхнічных прылад. Даведваючыся пра іх, мы крок за крокам набліжаемся да разгадкі свету кіно.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Паглядзіце ў электронным дадатку фільмы «Паліты палівальшчык» і «Прыбыццё цягніка», створаныя братамі Люм'ер. Параўнайце сюжэты фільмаў. Чым, на ваш погляд, яны адрозніваюцца? Які з фільмаў стаў пачаткам развіцця дакументальнага кіно, а які — мастацкага? Патлумачце свой адказ.

2. Паглядзіце ў электронным дадатку фрагмент фільма «Падарожжа на Месяц» Жоржа Мельеса. Знайдзіце ў ім некалькі спецэфектаў. Раскажыце пра адзін з іх.

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ



3. Спробы ўлавіць *рух* працягваюцца і сёння. Самы просты прыклад — «цуда-нататнік». На яго старонках малююць фігурку чалавека або жывёлы. На кожнай новай старонцы — новы рух часткі фігуркі, напрыклад тулава або рукі. Калі хутка прагартаць старонкі нататніка, ствараецца ілюзія руху фігуркі — як быццам фрагмент фільма. Паспрабуйце зрабіць «цуда-нататнік» самастойна. Для гэтага неабходна:

- набыць невялікі нататнік даўжынёй не больш за 15 см;



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

- намаляваць у правым ніжнім ражку кожнай старонкі фігурку чалавека або жывёлы ў новай фазе руху;
- сагнуць нататнік і з дапамогай вялікага пальца хутка прагартаць усе старонкі.

Раскажыце, што ў вас атрымалася.

## § 21–22. ГУЛЬНЯВОЕ (МАСТАЦКАЕ) КІНО


Кадр з фільма «Вялікае рабаванне цягніка» (рэжысёр Э́двін По́ртэр)



Афіша фільма «Лясная быль» (рэжысёр Юрый Тарыч)

Мастацкае кіно — адзін з самых папулярных відаў мастацтва. Сёння мастацкае кіно часта называюць гульнявым — ад слова «гульня».

***Першыя мастацкія фільмы.*** Першы мастацкі фільм назваць цяжка. Хтосьці лічыць, што гэта фільм «Паліты палівальшчык» братоў Люм’ер. А некаторыя даследчыкі мяркуюць, што першы мастацкі фільм — «Вялікае рабаванне цягніка» (гл. электронны дадатак). У ім мы знаёмімся з невялікім, але яркім аповедам.

Рабаўнік цягніка паварочваецца ў бок гледача і страляе ў сваіх пераследнікаў. Узнікае нечаканы эфект стрэлу ў глядзельную залу. Многія людзі хадзілі на кінасеанс толькі для таго, каб паглядзець гэты фрагмент і адчуць «страх і жах» зноў і зноў.

Першы беларускі фільм «Лясная быль» стварыў Юрый Та́рыч па аповесці «Свінапас» Міхася Чарота. Галоўны герой фільма нагадвае былiннага персанажа. Ён увесь час трапляе ў складаныя сітуацыі, але з лёгкасцю



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

іх пераадольвае. Фільм «Лясная быль» зняты ў беларускай вёсцы Прылу́кі ў вядомай сядзібе графа Ча́пскага. Акцёрамі былі звычайныя людзі, якія ігралі саміх сябе.

***Як нараджаецца ідэя фільма?*** Стварэнне мастацкага фільма — працяглы працэс. Пачынаецца ён з задумы — ідэі. Напрыклад, ідэі стварыць станоўчага або адмоўнага героя. Аўтарам ідэі фільма можа стаць кожны чалавек. Аднак прапанаваць нешта сапраўды новае і цікавае надзвычай складана. Напрыклад, Жорж Мельес ідэі многіх фільмаў знаходзіў у творах вядомага пісьменніка-фантаста Жуля Верна. Ідэю для фільма «Паліты палівальшчык» браты Люм'ер запазычылі з коміксаў.

**Ко́мікс** — гісторыя, расказаная ў малюнках.

Карціна беларускага рэжысёра Алены Ту́равай «Кіндэр-Вілейскі прывід» знята па матывах навелы Оскара Уайльда «Кентэрві́льскі прывід». Аўтары фільма перанеслі апісаныя ў навеле падзеі з англійскага замка Кентэрвіль на тэрыторыю Вілейскага раёна нашай краіны. Здымалі фільм у старадаўнім асабняку, размешчаным у Гродзенскай вобласці.



Палац Святаполк-Чацвярцінскіх (г. п. Жалудок, Беларусь) — замак у фільме «Кіндэр-Вілейскі прывід»



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

***Праца над сцэнарыем.*** На аснове ідэі фільма пішацца сцэнарый. Гэта літаратурны твор, у якім паслядоўна выкладаюцца сюжэтныя лініі, раскрываюцца характары герояў, распрацоўваюцца дыялогі. Асноўнае патрабаванне да *сцэнарыста* — напісаны ім сцэнарый павінен быць займальным і цікавым. Чым больш дэтальна напісаны сцэнарый, чым яскравейшыя дыялогі персанажаў, тым лепшы будзе фільм.

**Сцэна́рый** — літаратурная аснова фільма.

***Навошта патрэбны рэжысёр?*** Адной з галоўных фігур на здымачнай пляцоўцы з'яўляецца рэжысёр. Ён адказвае за мастацкае ўвасабленне задумы фільма на экране, кіруе кінапрацэсам і ўсімі службамі. А таксама дае каманды «Камера!» або «Знята!».

***Што робіць мастак?*** Пакуль вядзецца праца над сцэнарыем, рэжысёр і мастак рыхтуюць *раскадроўку*. Мастак замалёўвае кожную сцэну (або эпізод) фільма на асобным аркушы паперы ў адпаведнасці са сцэнарыем. Атрымліваецца незвычайна доўгі комікс. Раскадроўка дапамагае зразумець, як трэба «расказваць» гісторыю, *як* данесці да гледача галоўную ідэю фільма і *якімі* павінны быць персанажы. Малюнак расказвае значна больш, чым словы.

**Раскадро́ўка** — фільм у малюнках.



Прыклад раскадроўкі з фільма «Кіндэр-Вілейскі прывід»



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Рэжысёр тлумачыць задачу актрысе



Рэжысёр працуе з акцёрам-трусам

***Акцёр кіно.*** У стварэнні фільма вельмі важны этап падбору акцёраў для галоўных, другарадных і эпізадычных роляў. Праца рэжысёра з акцёрам — адказны працэс. Рэжысёр ставіць задачу, а акцёр гэту задачу імкнецца выканаць.

***Хто адказвае за знешні выгляд герояў фільма?*** Для кожнага героя распрацоўваецца эскіз касцюма. *Мастак па касцюмах* стварае вобраз героя і вобраз кінастужкі ў цэлым. Дэталі вопраткі дазваляюць зразумець характар персанажа і эпоху, у якой ён жыве. Самыя складаныя касцюмы — у гістарычных і навукова-фантастычных фільмах.



Праца касцюмераў

Вобраз героя завяршае *грым*. Стварэнне грыму патрабуе вялікага майстэрства і фантазіі. У некаторых выпадках *грымёр* працуе над вобразам кінагероя некалькі гадзін.

***Праца аператара.*** Усе падзеі з дапамогай камеры фіксуе аператар. Ён адказвае за кадры будучага фільма: як будзе зняты герой ці падзея, якімі будуць асвятленне і колер.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Праца аператара

Адна з важных для кожнага рэжысёра традыцый — разбіць талерку на поспех! Гэта адбываецца пасля знятага першага плана. Асколкі талеркі члены здымачнай групы падбіраюць і доўга захоўваюць. Многія — да канца здымак, а рэжысёр — на працягу ўсяго жыцця.

Веданне асноўных этапаў стварэння мастацкага фільма дапаможа стаць больш дасведчанымі гледачамі і лепш зразумець задуму кінастужкі.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Назавіце свой любімы мастацкі фільм. Раскажыце аднакласнікам, чаму ён вам падабаецца. Што асабліва запомнілася ў гэтым фільме?

2. Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах мультфільм «Фільм, фільм, фільм» рэжысёра Фёдара Хітрука. Пра якія кінапрафесіі распавядае аўтар? Складзіце пра адну з кінапрафесій вусны аповед. Чаму для свайго аповеду вы выбралі менавіта гэту кінапрафесію?

3. Якія кінатрадыцыі, акрамя той, пра якую распавядаецца ў параграфе, вам вядомыя? Раскажыце пра іх у класе падрабязней.

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

4. У аснове сюжэта кінафільма — цікавая, займальная гісторыя, у якой герой трапляе ў розныя простыя і не вельмі простыя сітуацыі. Раскажыце пра адну са сваіх прыгод у малюнках: зрабіце на аркушы фармату А4 раскадроўку. Кожная прыгода — асобны малюнак. Затым пазнаёмце з вашымі малюнкамі аднакласнікаў. Ці спадабалася ім ваша работа?
Падзяліцеся, у чым заключалася асноўная складанасць выканання раскадроўкі.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

# § 23–24. ВУЧЫМСЯ РАЗУМЕЦЬ КІНО

Кіно як від мастацтва мае ўласныя сродкі выразнасці. З іх дапамогай аўтары імкнуцца данесці да гледача задуму фільма.

***Роля выявы ў кіно.*** Настройваючыся на сустрэчу з фільмам, глядач у першую чаргу рыхтуецца *глядзець*. Менавіта глядзець, а не слухаць. Гэта значыць, што важным сродкам выразнасці з'яўляецца *выява*. Чалавек ва ўсе часы спрабаваў захаваць свае назіранні — на камені, драўлянай дошчачцы, папірусе, паперы. Думаў пра тое, *што* намаляваць, *як* размясціць намаляваныя прадметы і зрабіць малюнак больш выразным. Стваральнікі фільмаў таксама задумваюцца менавіта над гэтымі пытаннямі: *што* здымаць і *як* зрабіць зняты матэрыял выразным.

***Галоўны сродак выразнасці — дзеянне!*** Не кожная гісторыя можа стаць асновай фільма. Не кожнае апавяданне або аповесць можна экранізаваць. Па-сапраўднаму цікавыя гісторыі, у якіх шмат дзеяння. Чым больш у іх нечаканых паваротаў сюжэта і падзей, тым больш яскравае кіно. Прыдумайце добрае апавяданне, насычанае цікавымі падзеямі — і можаце лічыць сябе сцэнарыстам!

Такую гісторыю можна не толькі расказаць, але і намаляваць. А гэта значыць, што па ёй можна зняць кіно. Невыпадкова так папулярныя фільмы, знятыя па коміксах. Кожны малюнак комікса —




Кадры з фільма «Марозка» (рэжысёр Аляксандр Роу)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

гэта асобны кадр, у якім зафіксаваны персанаж і дзеянне, якое ён здзяйсняе. Гэта можа быць адна фаза руху — напрыклад, скачок. Або яркае праяўленне эмоцый — радасць, здзіўленне, страх.

**Кадр** — здымак, на якім зафіксавана адна фаза руху.

**Манта́ж** — паслядоўнае злучэнне асобных кадраў фільма.

На дзейсны бок кіно мы звяртаем увагу ў першую чаргу. Пераказваючы сюжэт прагледжанага фільма, апавядальнік абапіраецца на галоўныя падзеі, у якіх вылучае і апісвае ўчынкі герояў.

***Мантаж у кіно.*** Дзеянне ў кіно шмат у чым залежыць ад такога сродку выразнасці, як мантаж. Кожны кадр — адна падзея. Некалькі злучаных паміж сабой кадраў — гэта ўжо фільм. У залежнасці ад таго, як і ў якой паслядоўнасці будуць выкарыстаны кадры, можна цалкам змяніць сюжэт кінагісторыі.



Давайце ўявім, што чалавек чакае аўтобус на працягу адной гадзіны. Сродкамі мантажу гэта можна паказаць усяго за 30 секунд. У першым кадры фіксуем першае імгненне чакання, а ў другім — апошняе. Час для гледача бяжыць незаўважна. Так з дапамогай мантажу доўгую гісторыю можна зрабіць кароткай, сумную — вясёлай, невыразную — выразнай і цікавай. А фільм — яркім, дынамічным і запамінальным.

***Колер і святло ў кіно.*** Важныя сродкі выразнасці ў кіно — колер і святло. Колеравая гама і асвятленне дапамагаюць улавіць драбнюткія дэталі падзей, якія адбываюцца на экране. У фільме «Горад майстроў» рэжысёр Уладзімір Бычкоў асаблівую ўвагу засяродзіў на колерасветлавым вырашэнні. Цёплыя і халодныя тоны



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»





Кадры з фільма «Горад майстроў» (рэжысёр Уладзімір Бычкоў)

падказваюць гледачу асаблівасці ўзаемаадносін герояў — прыгажуні Веранікі і герцага дэ Малікóрна. Арыгінальны грым акцёра, які выконвае ролю герцага, дае яшчэ адну падказку. Ён падкрэслівае каварны характар персанажа. Закаханы ў Вераніку герцаг змятае на сваім шляху ўсе перашкоды, кожны дзень прыдумляючы новыя спосабы, як заваяваць яе сэрца.

***Гукавое вырашэнне фільма***. Вялікае значэнне ў кіно мае гук — маўленне, музыка, шумавыя эфекты. *Кінамузыка* ўзмацняе эмацыянальнае ўздзеянне фільма на гледача. Гэта могуць быць песні, класічная або эстрадная музыка. Галоўны герой фільма «Горад майстроў» Каракóль — добры і чулы юнак, які выратаваў горад ад герцага Малікорна, — выконвае дзівосную песеньку. Яна напісана ў духу старадаўніх балад і акунае гледача ў атмасферу Сярэднявечча.

**Кінаму́зыка** — музычнае суправаджэнне фільма.

***Якую ролю ў кіно выконваюць дэкарацыі?*** Стварыць атмасферу старадаўняга горада таксама дапамагаюць дэкарацыі да фільма. Нават невялікая памылка дэкаратара можа цалкам парушыць атмасферу фільма. Таму дэталі дэкарацый да гістарычных фільмаў распрацоўваюцца на аснове старажытных рукапісаў, газет, кніг, часопісаў. Карпатліва ўзнаўляюцца дамы, помнікі архітэктуры, асобныя памяшканні. Так, напрыклад, для ўзмацнення праўдзівасці



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Кадр з фільма «Кінг-Конг»
(1933, рэжысёр Мэ́рыян Ку́пер)



Кадр з фільма «Кінг-Конг»
(2005, рэжысёр Пі́тэр Джэ́ксан)

некаторыя сцэны фільма «Горад майстроў» здымаліся ў натуральных дэкарацыях — каля сцен манастыра Святой Брыгі́ты ў эстонскім горадзе Таліне.

***Спецэфекты ў кіно.*** Важную ролю ў ажыццяўленні фантазіі аўтара фільма маюць спецэфекты. Першыя спецэфекты з'явіліся адначасова з нараджэннем кіно. Паскораныя або запаволеныя здымкі, знакаміты стоп-кадр Жоржа Мельеса…

**Спецэфе́кт** — прыём, які выкарыстоўваецца для здымак сцэн, якія немагчыма зняць звычайным спосабам.

Сучасныя спецэфекты — гэта складаныя прыёмы стварэння персанажаў або дэкарацый. Касмічныя караблі, дыназаўры, лялечныя персанажы, гістарычныя атрыбуты, створаныя з дапамогай камп'ютарнай графікі, робяцца ўсё больш эфектнымі і даставернымі.

Сапраўднае кіно аб'ядноўвае ў сабе выразныя сродкі розных відаў мастацтва. Ведаючы іх асаблівасці, мы зможам не толькі зразумець ідэю фільма, але і ўбачыць, якім чынам аўтары здолелі данесці яе да гледача.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Працэс стварэння фільма не проста складаны — у мастацтве гэта самы маштабны праект. Кінастудыя «Беларусьфільм» — гэта горад у горадзе. Наведайце афіцыйны сайт кінастудыі (belarusfilm.by) і паглядзіце відэаролік «Кино снимают здесь!». Раскажыце, якія майстэрні вы ўбачылі. На што звярнулі ўвагу? Што вас здзівіла?

2. Важны сродак выразнасці ў кіно — план, або адлегласць ад камеры да здымачнага аб'екта. У электронным дадатку выберыце 3–4 выразныя планы, ахарактарызуйце іх. Паразважайце на гэтых прыкладах, якую ролю выконваюць выбраныя вамі кадры ў задуме рэжысёра.

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Прачытайце верш Агніі Барто.

### Сильное кино

Заранее, заранее
Всё было решено:
У школьников собрание,
Потом у них кино.
Домой придёт
Мой старший брат,
Он мне расскажет
Всё подряд,
Он объяснит мне,
Что к чему.
А я большая!
Я пойму.
И вот он начал
Свой рассказ:
— Они ползут,
А он им — раз!
А тут как раз
Она ползла,
А он как даст ему
Со зла!
Они ей — раз!
Она им — раз!
Но тут как раз
Её он спас,
Он был с ней
Заодно...
Ух, сильное кино!
Нет, видно, я ещё мала:
Я ничего не поняла.

Пра якую забаўную сітуацыю распавядае паэтка? Ці бывалі ў вас такія кур'ёзныя выпадкі? Якія фільмы, на ваш погляд, адпавядаюць апісанню хлопчыка?

4. Прыдумайце арыгінальную гісторыю (5–6 сказаў). Напрыклад пра тое, як вы былі… нябачным. Займальна раскажыце гэту гісторыю, выкарыстоўваючы жэсты, паўзы, пластыку. Паспрабуйце быць максімальна выразным.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

# § 25. АНІМАЦЫЙНАЕ КІНО

Мультфільмы — адзін з відаў кінамастацтва. Яны заслужылі любоў і шчырае прызнанне як дзяцей, так і дарослых.

У сучаснай культуры мультыплікацыйнае кіно часцей называюць анімацыйным. Гэта звязана з тым, што спосабы і тэхнічныя прыёмы стварэння фільма ў канцы 20 стагоддзя сталі больш разнастайнымі. Анімацыя — не проста множанне некалькіх выяў. Перш за ўсё гэта адушаўленне любога прадмета, нават самага незвычайнага.

**Мультыплікáцыя** — множанне выяў.
**Анімáцыя** — адушаўленне, ажыўленне.

***Як з'явіліся мультфільмы?*** Анімацыйнае кіно з'явілася раней, чым гульнявое. У 1892 годзе ў Францыі вынаходнік Эмíль Рэйнó прадэманстраваў невялікія фільмы, якія атрымалі назву «пантамімы, што свецяцца». Аўтар сам маляваў і размалёўваў сваіх герояў — клоўнаў, канькабежцаў, школьнікаў, а затым паказваў іх на сваім апараце. Многія прыёмы Рэйно леглі ў аснову мастацтва анімацыі.

Першага яркага маляванага персанажа стварыў французскі мастак Эміль Коль. У яго фільме «Фантасмагорыя» з'явіўся



Кадр з анімацыйнага фільма «Бедны П'еро» (рэжысёр Эміль Рэйно)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Кадр з анімацыйнага фільма «Фантасмагорыя» (рэжысёр Эміль Коль)

смешны, але выразны герой «фанто́ш», які адразу спадабаўся гледачам.

Многія знаходкі Э. Коля — фантастычныя ператварэнні, людзі і рэчы, якія лётаюць, мікробы, што ажываюць, — у наступныя дзесяцігоддзі з задавальненнем выкарыстоўвалі іншыя аніматары.

Заснавальнікам савецкай анімацыі стаў рэжысёр Іван Іваноў-Вано́. Дзякуючы яму з 1927 года сталі з'яўляцца фільмы для дзяцей.

Работы І. Іванова-Вано адразу ўразілі аўдыторыю. У якасці выяўленчага матэрыялу ў фільме «Поры года» аўтар выкарыстаў прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Шырока прадстаўлены гліняны посуд, карункі, роспісы, арнамент. У фільме



Кадр з анімацыйнага фільма «Казка пра мёртвую царэўну і сем волатаў» (рэжысёр Іван Іваноў-Вано)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Кадр з анімацыйнага фільма «Сеча пры Кержанцы» (рэжысёры Іван Іваноў-Вано, Юрый Нарштэйн)

«Казка пра мёртвую царэўну і сем волатаў» асновай выявы сталі палотны Віктара Васняцова. У анімацыйнай фантазіі «Сеча пры Ке́ржанцы» на музыку Мікалая Рымскага-Корсакава аўтары выкарыстоўваюць рускі іканапіс 15–16 стагоддзяў.

***Лялечная анімацыя.*** Заснавальнікам лялечнай анімацыі лічаць Уладзіслава Старэвіча. Персанажы яго фільмаў «Жыццё стракоз», «Страказа і мураш» — дакладныя копіі насякомых. У пачатку 20 стагоддзя тэхніка ажыўлення герояў настолькі здзівіла гледачоў, што пасля дэманстрацыі фільмаў У. Старэвіча ўражаныя журналісты пісалі пра дрэсіраваных жукоў!



Кадр з анімацыйнага фільма «Страказа і мураш» (рэжысёр Уладзіслаў Старэвіч)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Кадр з фільма «Адажыа»
(рэжысёр Гары Бардзін)

Героямі лялечных фільмаў могуць стаць самыя нечаканыя прадметы — цвікі, іголкі, запалкі, вяроўкі. У філасофскай прытчы «Ада́жыа» расійскага рэжысёра Га́ры Ба́рдзіна апавядаецца пра складаны шлях пошуку новых ідэй. Персанажы фільма створаны ў тэхніцы арыгамі з паперы светлых і цёмных адценняў, якія ўвасабляюць сілы, што супрацьстаяць адна адной. Музыка знакамітага «Адажыа» італьянскага кампазітара Тама́за Альбіно́ні ўзмацняе эмацыянальнае напружанне гледача і дапамагае зразумець сэнсавыя лініі фільма.



Кадр з анімацыйнага фільма «Прыгоды Несцеркі» (рэжысёр Ігар Волчак)



Вокладка да зборніка мультфільмаў «Калядныя аповеды» (рэжысёр Ірына Кадзюкова)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Героі мультфільмаў увайшлі амаль у кожны дом. Мы пазнаём іх па голасе, рэпліках, песнях. З іх дапамогай знаёмімся з казкамі, вершамі, апавяданнямі. Побач з імі радуемся і сумуем. Разам з імі мы спазнаём свет!

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Паглядзіце ў электронным дадатку або інфармацыйных крыніцах фрагменты анімацыйных фільмаў, прадстаўленых у параграфе. Якое ўражанне фільмы зрабілі на вас? Які з іх вам спадабаўся больш? Чаму?

2. Складзіце топ-10 сваіх любімых анімацыйных герояў. Патлумачце свой выбар.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Эміль Рэйно, Эміль Коль, Уладзіслаў Старэвіч стварылі першых анімацыйных персанажаў. Менавіта з іх пачалася гісторыя анімацыйнага кіно.

Паспрабуйце прыдумаць і намаляваць свайго героя (работу можна выканаць у групе). Які ў яго будзе характар — вясёлы або сумны, мяккі ці суровы? Прадумайце, як будзе выглядаць яго твар (форма галавы, носа, вуснаў), міміка, фігура. Як будзе апрануты ваш персанаж? Якія колеры для вашай работы вы выберыце? На якім фоне вы адлюструеце героя (прырода, памяшканне)? Чым ён займаецца? Не забудзьцеся пра дэталі, якія дапамогуць гледачу лепш зразумець вобраз (акуляры, вусы, капялюшык). Магчыма, вы падбераце для яго цікавы саўндтрэк[1]. Правядзіце ў класе конкурс «Самы арыгінальны мультыплікацыйны герой».

## § 26. АНІМАЦЫЙНАЕ КІНО БЕЛАРУСКІХ МАЙСТРОЎ

Свая гісторыя і ў беларускай анімацыі. Многія фільмы, створаныя на кінастудыі «Беларусьфільм», адзначаны ўзнагародамі на міжнародных фестывалях.

[1] Саўндтрэ́к — музычнае суправаджэнне фільма, тэлеперадачы, камп'ютарнай гульні і інш.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Кадр з фільма
«Песня жаўрука»
(рэжысёр
Таццяна Кубліцкая)

***Беларускія праекты.*** Беларускі рэжысёр-аніматар Ігар Во́лчак стварыў некалькі ўнікальных праектаў. Адзін з іх — поўнаметражны анімацыйны фільм «Прыгоды Несцеркі», зняты па матывах беларускіх народных казак. Галоўны герой — добры знаходлівы Несцерка — разам са сваімі сябрамі сабакам і катом пастаянна трапляе ў складаныя сітуацыі.

Дзівосныя калядныя гісторыі распавяла ў сваіх работах рэжысёр Ірына Кадзюко́ва. Калядныя святы — дванаццаць студзеньскіх дзён ад Нараджэння Хрыстовага да Вадохрышча. У гэтыя светлыя дні людзі здзяйсняюць добрыя ўчынкі. Некалькі гісторый пра дабрыню, чалавекалюбства і міласэрнасць леглі ў аснову яе анімацыйнага цыкла «Калядныя аповеды».

Фільм «Дзяўчынка з запалкамі» зняты па матывах казкі Ха́нса Крысція́на А́ндэрсена. Напярэдадні Каляд людзі праходзяць



Кадр з фільма
«Песня жаўрука»
(рэжысёр
Таццяна Кубліцкая)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»


Праца над вобразам для фільма «Песня жаўрука» (рэжысёр Таццяна Кубліцкая)

паблізу дзяўчынкі, якая прадае запалкі. Каб сагрэцца, гераіня фільма спальвае адну запалку за другой. У нейкі момант запалкі заканчваюцца... Душа дзяўчынкі, нібы душа анёла, імкнецца да кожнага гледача, змякчаючы сэрцы, заклікаючы да міласэрнасці і спагады.

Абаяльныя героі сустракаюць гледача ў анімацыйным фільме «Песня жаўрука» Таццяны Кублі́цкай. У аснове сюжэта — аднайменная казка Леаніда Ула́шчанкі пра дзівосныя песні Жаўрука, якімі ён сустракае прыход вясны. У чараду знаёмых вобразаў беларускай прыроды — пралескі, лясны ручаёк — арганічна ўплятаецца арыгінальная музыка. Лёгкая кранальная песенька ў выкананні беларускага школьніка завяршае вобраз і галоўнага героя, і мультфільма ў цэлым.

***Як ствараецца герой мультфільма?*** Стварэнне анімацыйнага персанажа — працэс складаны. У першую чаргу распрацоўваецца вобраз героя ў адпаведнасці з яго характарам, апісаным у сцэнарыі. Вобраз героя — гэта своеасаблівы партрэт, у якім заяўлены характар персанажа. Мастак робіць простыя замалёўкі персанажа ў некалькіх варыянтах, і паступова вобраз ажывае. З'яўляюцца толькі яму ўласцівыя асаблівасці — рухі, міміка, жэсты... Персанаж паслядоўна і скрупулёзна дапрацоўваецца, ствараюцца спецыяльныя лісты варыянтаў аблічча героя з розных бакоў. Толькі пасля гэтага аўтары ствараюць каляровую мадэль персанажа.


Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Беларуская анімацыя — высокае дасягненне ў мастацтве. Героі фільмаў Ігара Волчака, Ірыны Кадзюковай, Таццяны Кубліцкай і іншых мультыплікатараў добра вядомыя беларускаму гледачу. Магчыма, і ў вас атрымаецца заняць сваё месца ў гісторыі айчыннага кіно!

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Паглядзіце ў электронным дадатку фрагменты анімацыйных фільмаў беларускіх аўтараў, пра якія распавядаецца ў параграфе. Якую ўзнагароду за свае ўчынкі атрымліваюць галоўныя героі? Чаму?

2. Падбярыце і запішыце восем-дзесяць папулярных цытат з анімацыйных фільмаў (айчынных і замежных). Напрыклад, «Ребята, давайте жить дружно!», «Пустяки, дело житейское!» або «Когда одна мечта сбылась, ты отправляешься за новой». Правядзіце такую віктарыну з аднакласнікамі і — абавязкова! — з бацькамі. Хто адказваў на вашы пытанні лепш?

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Самыя папулярныя мультгероі з жывёльнага свету — кот, мядзведзь, мышаня і... Якога мультперсанажа вы паставілі б у гэты шэраг? Паспрабуйце з дапамогай руху перадаць вобраз гэтага героя. Ці пазналі яго вашы аднакласнікі?

Дакажыце папулярнасць заяўленага вамі мультперсанажа на канкрэтных прыкладах.

## § 27. ТВОРЧЫ ЎРОК: САМ САБЕ РЭЖЫСЁР

Мастацтва кіно трывала ўвайшло ў жыццё сучаснага чалавека. «Адлюстраваць уражанне зараз жа, у гэтае ж імгненне» — так кажуць пра яго магчымасці кінематаграфісты. Адны любяць глядзець кіно, паглыбляючыся ў гісторыі, расказаныя аўтарамі. Іншым падабаецца фіксаваць уласнае ўражанне і ствараць новыя гісторыі. І не важна, што гэтыя гісторыі, магчыма, ніхто не ўбачыць і не ацэніць... Сучаснаму чалавеку нескладана зняць гісторыю самому —



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

дастаткова скарыстацца тэлефонам. Можна, напрыклад, расказаць пра свой горад ці пасёлак. Галоўнае — пачаць здымаць, не баяцца эксперыментаваць, не баяцца памыляцца!

Давайце і мы з вамі паспрабуем *адлюстраваць сваё ўражанне*, выканаўшы кінапраект «Мой горад (пасёлак)». Для гэтага:

- Настройцеся на здымку. Падумайце пра месца, у якім вы жывяце. Што б вы хацелі расказаць пра яго жыхарам іншай краіны? У чым унікальнасць вашага горада ці пасёлка?
- Вызначце канкрэтнае месца (вуліца, сквер, парк, будынак, фантан і інш.), якое вы будзеце здымаць.
- Старанна прадумайце ракурс здымкі, планы, панараму (рух камеры).
- Вызначыцеся, на якіх дэталях запыніце ўвагу.
- Не забудзьцеся прыдумаць «разыначку» ў вашым фільме, паказаць самыя «цёплыя» і «ўтульныя» рысы вашага горада або пасёлка.
- Падрыхтаваліся… Пачалі!

Галоўнае — паказаць у кіназамалёўцы, што абранае вамі месца самае прыгожае ў свеце!



**Вадзім Шавы́ркін.**
Гарадскі пейзаж

У вольны час стварыце разам з аднакласнікамі старонку ў Instagram «Я родам з…». Размясціце на ёй фрагменты вашых фільмаў. Раскажыце пра свой горад ці пасёлак. Ці спадабаліся гісторыі вашым падпісчыкам?



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Раздзел 6

КАМП'ЮТАР МОЖА РЭАЛІЗАВАЦЬ МНОГІЯ ЗАДУМЫ.
АЛЕ ДАПАМАГАЕ ЁН ТОЛЬКІ ТАДЫ, КАЛІ ТЫ ВЕДАЕШ,
ШТО ІМЕННА АД ЯГО ХОЧАШ.

*Валерый Вядрэ́нка*

# МАСТАЦТВА «НА КОНЧЫКАХ ПАЛЬЦАЎ»



**Аляксандр Маруно́ў.** Зімовы пейзаж

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Для стварэння мастацкага твора майстру патрэбны розныя інструменты. Мастаку — алоўкі, пэндзлі, фарбы. Кампазітару — музычны інструмент. Архітэктару — чарцёжныя прылады…

Са з'яўленнем тэхнічных навінак адкрываюцца ўсё больш шырокія магчымасці для таго, каб ствараць непаўторныя творы. Змяняецца і само ўяўленне пра мастацтва, пашыраецца палітра відаў мастацкай творчасці.

Але тэхнічнае прыстасаванне само па сабе не здольна стварыць мастацкі твор. Як бы там ні было, ім кіруе чалавек. Менавіта ён і творыць мастацтва!

## § 28–29. ФАТАГРАФІЯ ЯК ВІД МАСТАЦТВА

Нас акружае мноства фотаздымкаў. На вуліцах гэта рэкламныя выявы, у тэатрах і на выставах — фотаафішы, дома — выявы блізкіх нам людзей і цікавых падзей.

**Фатагра́фія** — стварэнне і захаванне статычнай выявы пры дапамозе камеры.

Часта мы фатаграфуем самі. Убачыўшы нешта незвычайнае, чалавек імкнецца зафіксаваць свае назіранні — зняць іх на фотакамеру. Яшчэ больш мы любім пазіраваць перад камерай. Бо для нас мае значэнне не толькі цікавая падзея, але і наша прысутнасць там.

Сёння фатаграфія выкарыстоўваецца амаль ва ўсіх галінах жыцця чалавека. Здымкі патрэбныя для фіксацыі вынікаў навуковых адкрыццяў. Яны дапамагаюць нам даведацца пра падзеі, якія адбываюцца ў свеце. Любая інфармацыя, дапоўненая фотаздымкамі, становіцца больш яркай і выразнай. Менавіта таму без фотаздымкаў не абыходзяцца газеты, часопісы, кіно, тэлебачанне.

**Фотака́мера** — прылада для атрымання фотаздымкаў.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

***Як ствараецца фатаграфія?*** Паняцце «фатаграфія» паходзіць ад двух грэчаскіх слоў — «святло» і «пішу». Святло пранікае праз адтуліну аб'ектыва ў цёмную прастору камеры, трапляе на адчувальную паверхню, аб'ектыў зачыняецца і — выява захоўваецца. Яна «запісваецца» пры дапамозе святла за той кароткі перыяд часу, пакуль быў адчынены аб'ектыў. Невыпадкова гэты працэс параўноўваюць з працай чалавечага вока. Зрэнка — гэта аб'ектыў. Святло трапляе на сятчатку вока, а мозг апрацоўвае і запамінае выяву.

***Першыя фатографы, першыя фотаздымкі.*** Даследчыкі лічаць, што першы фотаздымак зрабіў у 1822 годзе французскі вынаходнік Жóзэф Ньепс. Гэта было 200 гадоў таму! Ён сфатаграфаваў від з акна свайго кабінета на алавяную пласцінку, пакрытую вельмі тонкім слоем бітуму[1], і так захаваў выяву. Для гэтага яму спатрэбілася цэлых восем гадзін пры яркім святле!



**Джэймс Максвел.**
Трохколерны бант

Першы каляровы здымак стварыў англійскі вучоны Джэймс Мáксвел. Ён сабраў адну выяву з трох здымкаў розных колераў —



**Жозэф Ньепс.**
Від з акна ў Ле Гра

[1] Бі́тум — у перакладзе з лац. 'горная смала', 'нафта'.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Фотаапарат
Жозэфа Ньепса
(музейны экспанат)

зялёнага, сіняга і чырвонага — і дэманстраваў яго на спецыяльным экране з падсветкай. А ўжо дзякуючы братам Люм'ер каляровая фатаграфія стала масавай.

Здымкі Ж. Ньепса і Д. Максвела наўрад ці здзівяць сучаснага гледача. Каштоўнасць іх работ у тым, што яны былі першыя.

**Фотамаста́цтва** — мастацтва стварэння мастацкіх фотаздымкаў.

***Фатаграфія як від мастацтва.*** Паступова фатографы сталі разумець, што атрыманыя імі выявы — гэта не толькі спосаб фіксацыі прадметаў і з'яў навакольнага свету. Фотаздымкі можна зрабіць прыгожымі, як, напрыклад, жывапісныя карціны. Фатографы хутка пераанялі ў мастакоў асноўныя законы выяўленчага мастацтва: прынцыпы пабудовы кампазіцыі, прыёмы перадачы святлаценю і перспектывы і г. д. Так людзі навучыліся ствараць не проста фотаздымкі, а творы мастацтва.

З часам фотакамера перастала быць заменай пэндзля мастака. Фатаграфія вылучылася ў самастойную сферу мастацтва.



**Філіп Халсман.**
Далі Ато́мікус
(серыя «Скачок»)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Вядомы фатограф 20 стагоддзя Філіп Ха́лсман стварыў унікальную серыю здымкаў «Скачок». Адна з самых яркіх работ гэтай серыі — партрэт іспанскага мастака Сальвадо́ра Далі́, які здзяйсняе скачок. Да здымак доўга рыхтаваліся. У выніку на здымку адлюстраваны не толькі мастак: у скачку зафіксаваны крэслы, мальберт, карціны. Асаблівую відовішчнасць фотапартрэту надаюць каты́, якія таксама скачуць, і знятая быццам у скачку вада.

***Фотаздымкі беларускіх майстроў.*** Важная ўласцівасць фотаздымка — яго дакладнасць. Тое, што мы бачым на выявах, сапраўды існавала ў момант здымкі — у рэальнасці, а не ў фантазіі аўтара. У драбнюткіх дэталях фатограф распавядае нам пра навакольны свет. Вядома, ён можа пры гэтым упрыгожыць і перайначыць рэчаіснасць з дапамогай спецыяльных тэхнічных прыёмаў. Але галоўны аб’ект здымкі не выдуманы, а рэальны. І калі пры гэтым майстру ўдаецца перадаць эмоцыі, настрой, вобраз, фотаздымак становіцца мастацкім.



**Леў Дашкевіч.**
Партрэт жонкі



**Сяргей Пракудзін-Горскі.**
Віцебск. Успенскі сабор



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



**Віктар Малышчыц.**
Траецкі касцёл
(в. Зáсвір, Беларусь)

Вялікую ролю ў развіцці мастацкай фатаграфіі адыгралі такія майстры, як Сяргей Пракýдзін-Гóрскі і Леў Дашкéвіч, якія адлюстравалі ў сваёй творчасці прыгажосць беларускай зямлі.

Сучасны беларускі фотамастак Віктар Малы́шчыц рэалізаваў унікальны праект «Беларусь у абдымках зорак». Ён стварыў фотаздымкі помнікаў беларускай архітэктуры на фоне начнога неба. Дзякуючы мастацтву майстра наша краіна паўстае перад гледачом у новым рамантычным абліччы.

З дапамогай сучаснай тэхнікі можна стварыць самыя розныя здымкі. Напрыклад, паказаць рух, як гэта зрабіў Ф. Халсман. Можна выхапіць унікальныя імгненні, як гэта зрабіў В. Малышчыц. Тэхніка стварэння фотаздымкаў бесперапынна рухаецца наперад, але кожны, хто трымае камеру ў руках першы раз, проста здымае тое, што бачыць перад сабой. Напрыклад, від з акна…

Многія фатографы бясстрасна фіксуюць рэчаіснасць. Некаторыя — перайначваюць яе. Але і тыя і іншыя дапамагаюць чалавеку пранікнуць у таямніцы навакольнага свету, захаваць на доўгія гады знаёмыя вобразы.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Уважліва разгледзьце фотаздымкі, прадстаўленыя ў параграфе і электронным дадатку. Падзяліцеся з аднакласнікамі ўражаннямі пра іх.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

2. Разгледзьце ўважліва ў электронным дадатку фотаздымкі пачатку 20 стагоддзя С. Пракудзіна-Горскага і Я. Булгака. Ахарактарызуйце адзін з іх.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Што такое калаж, вы ўжо ведаеце. А з тым, што такое *фотакалаж*, вы пазнаёміцеся ў час працы над ім. Выражыце з пяці-сямі фотаздымкаў некалькі фрагментаў, якія падаліся вам арыгінальнымі. Затым збярыце гэтыя фрагменты на шчыльным аркушы паперы фармату А4. Магчыма, вы паспрабуеце некалькі варыянтаў, перш чым выбраць найлепшы. І толькі потым акуратна прыклейце гэтыя фрагменты на паперу. Прыдумайце вашаму фотакалажу арыгінальную назву. Прадэманструйце работу сябрам.

## § 30–31. ТЭЛЕБАЧАННЕ

*Тэлебачанне* — гэта не толькі спосаб распаўсюджвання інфармацыі, але і адзін з відаў мастацтва. Кожны чалавек можа выбраць тую перадачу, якая яму асабліва падабаецца. Хтосьці рэгулярна праглядае выпускі навін або трансляцыі спартыўных спаборніцтваў. Хтосьці аддае перавагу праграмам па кулінарыі або дызайну інтэр'ераў. А хтосьці — пазнавальным перадачам пра свет жывёл. Тэлебачанне можа паказаць чалавеку тое, што яму цікава. Кожны канал дэманструе сваю праграму. Але выбірае канал менавіта глядач.

**Тэлеба́чанне** — перадача рухомай выявы і гуку на адлегласці.





Першыя савецкія тэлевізары 1930-х гг. Экран 3 × 4 см, вага — больш за 30 кг



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

***Што такое «эфект прысутнасці»?*** Тэлебачанне ахоплівае ўсю разнастайнасць нашых інтарэсаў. Вядома, мы можам атрымаць інфармацыю і з іншых крыніц: кніг, часопісаў, газет. Але ў тэлебачання ёсць несумненная перавага. Уключаючы тэлевізар, выкарыстоўваючы магчымасці інтэрнэту, мы не толькі знаёмімся з інфармацыяй. Мы нібы знаходзімся побач з тым, што адбываецца. Такі эфект атрымаў назву «эфект прысутнасці». Дамагчыся эфекту прысутнасці, зрабіць выяву на экране цікавай, сумясціць гук з выявай — гэта ўжо не проста перадача інфармацыі. Гэта мастацтва!

Слова «тэлебачанне» як быццам узята з казкі або з фантастычных гісторый. Выява і гук раскладваюцца на асобныя элементы. Гэтыя элементы перадаюцца па правадах або з дапамогай радыёсігналу, а затым зноў «збіраюцца» ў першапачатковай паслядоўнасці і — ператвараюцца ў эфектную карцінку.

***Гісторыя тэлебачання.*** Першая тэлеперадача адбылася 26 чэрвеня 1928 года ў горадзе Ташкенце. Першы тэлевізійны прыёмнік атрымаў назву «тэлефот».

Тэлевізары ў момант з'яўлення тэлебачання былі вялікай рэдкасцю. Яны каштавалі вельмі дорага — амаль як палова аўтамабіля. Каб глядзець перадачы на маленькіх экранах, зверху на іх навешвалі вялікае павелічальнае шкло.




Прагноз надвор'я. Тэлеканал «ОНТ»

***Інфармацыйныя тэлеперадачы.*** Першыя тэлеперадачы былі інфармацыйнымі. Напрыклад, выпускі навін і выступленні дзяржаўных асоб. Інфармацыйныя перадачы папулярныя і сёння. У іх паведамляецца пра тое, што адбываецца ў свеце: у эканоміцы, культуры, спорце.

Сучасныя тэлевізійныя прыёмнікі даступныя вялікай колькасці



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»




Тэлевізійны праект «Я ведаю!». Тэлеканал «Беларусь-1»

людзей, а якасць тэлевізійнай тэхнікі дасягнула высокага ўзроўню. Тэлебачанне стала значна больш разнастайным. Асаблівую папулярнасць атрымалі забаўляльныя і пазнавальныя перадачы.

***Забаўляльныя і пазнавальныя тэлеперадачы.*** Да забаўляльных можна аднесці канцэрты, тэлефільмы і спецыяльныя тэлепраекты. А пазнавальныя знаёмяць гледачоў з цікавымі сюжэтамі з розных галін ведаў. Яны могуць быць прысвечаны дзікай прыродзе, навуковым эксперыментам, гістарычным падзеям, падарожжам і славутым мясцінам.

***Перадачы ў прамым эфіры і ў запісе.*** Адны тэлевізійныя перадачы вядуцца ў прамым эфіры. Глядач у рэальным часе можа ўбачыць і пачуць тое, што адбываецца ў самых далёкіх кутках планеты. Гэтым тэлебачанне адрозніваецца ад фатаграфіі, радыё і




Тэлевізійны праект «Зорны шлях». Тэлеканал «ОНТ»



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Праект «Жывая спадчына». Тэлеканал «Беларусь-3»

кінематографа. Другія перадачы тэлебачанне транслюе ў запісе. Але галоўная асаблівасць тэлемастацтва — эфект прысутнасці гледача пры падзеях, якія адбываюцца па той бок экрана, — захоўваецца заўсёды.

***Чым тэлебачанне адрозніваецца ад кінематографа?*** На тэлебачанні існуюць свае правілы і законы. Яны складваліся паступова. Напрыклад, у кінематографе, каб зняць толькі адно дзеянне, акцёр здзяйсняе яго некалькі разоў. На тэлебачанні дзеянне здымаецца дзвюма-трыма камерамі і яго не даводзіцца паўтараць. Затым усе камеры па чарзе транслююць выяву, а глядач, знаходзячыся перад экранам тэлевізара, становіцца актыўным удзельнікам тэлепадзей.

Такім жа чынам — адразу праз некалькі мікрафонаў — запісваецца і перадаецца гук. Адзін мікрафон — для дыктара, па другім шуміць вецер, а па трэцім рэпарцёр каментуе выяву. У кіно гук накладаецца на знятае відэа па чарзе — спачатку вецер, затым закадравае маўленне, а потым музыка. Такія прыёмы выкарыстоўваюцца для таго, каб паказаць усё, што адбываецца ў прамым эфіры, найбольш ярка і выразна.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Праца тэлевізійнай студыі

І ў кіно, і на тэлебачанні мы бачым рухомую выяву і чуем гук. Але толькі тэлебачанне дасягае эфекту «тут і цяпер»!

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія тэлеперадачы вы глядзіце часцей — інфармацыйныя, пазнавальныя або забаўляльныя? Назавіце адну з любімых тэлеперадач. Патлумачце свой выбар.

2. Важная частка працы на тэлебачанні — інтэрв'ю. Падрыхтуйце пяцьшэсць арыгінальных пытанняў для інтэрв'ю з прадстаўніком цікавай прафесіі. Не забудзьцеся пра галоўнае правіла добрага інтэрв'ю: каб перадача атрымалася змястоўнай, неабходна задаваць толькі тыя пытанні, якія цікавыя табе самому.

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Падзяліцеся на тры групы. Распрацуйце ў кожнай групе праект тэлеперадачы «Галоўная падзея ў нашым класе». Прадумайце асноўныя ролі: аўтар тэксту, фатограф (аператар), дыктар.

Першая група рыхтуе інфармацыйную перадачу. Другая — забаўляльную, трэцяя — пазнавальную.

Які праект, на вашу думку, атрымаўся лепш? Які праект было рыхтаваць найбольш складана? Чаму? Што было для вас у выкананні задання самым цяжкім і нечаканым?



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

# § 32–33. КАМП'ЮТАРНАЕ МАСТАЦТВА

У штодзённым жыцці мы часта сустракаемся з творамі камп'ютарнага мастацтва. Аднак ці звяртаем мы ўвагу на тое, наколькі дакладна прамаляваны персанаж у камп'ютарнай гульні? Ці заўважаем незвычайны будынак або ландшафт у сучасным мастацкім фільме? А ўсё гэта мастак стварае з дапамогай камп'ютарнай тэхнікі.

Мастацкі твор, створаны з дапамогай камп'ютара, — таксама мастацтва! У яго аснову пакладзены матэматычныя законы і паняцці — напрыклад, прапорцыі. Але калі пры стварэнні твораў традыцыйных відаў мастацтва гэтыя параметры задае сам аўтар, то ў сучасным мастацтве для гэтага часта выкарыстоўваюцца тэхніка і формулы.

Так паступова, з лічбаў, літар, а потым і пікселяў[1] пачалося нараджэнне камп'ютарных відаў мастацтва — *графікі, анімацыі, музыкі*.

**Камп'ютарнае мастацтва** — від мастацтва, творы якога ствараюцца і дэманструюцца з дапамогай камп'ютарных тэхналогій.

***Камп'ютарная графіка.*** Камп'ютарная графіка адкрыла перад майстрамі мастацтва новыя гарызонты. Яна шырока выкарыстоўваецца ў кінематографе, на тэлебачанні, у рэкламе, гульнях, прэзентацыях. З дапамогай спецыяльных камп'ютарных праграм і інструментаў мастакі камп'ютарнай графікі сёння могуць ствараць і апрацаваць любую выяву, змадэляваць любы прадмет.

Эксперыменты па стварэнні мастацкіх вобразаў з дапамогай камп'ютарнай графікі далі нечаканы вынік. У мастакоў з'явіліся

[1] Піксель — мінімальны і непадзельны элемент (кропка), з якіх складаецца выява на экране манітора.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



**Сарэл Тэран.**
Карціна з цыкла
«Іншыя светы»
(Паўднёвая Афрыка)

больш шырокія магчымасці ўвасабляць прадметы, людзей, жывёл, а таксама выдуманых персанажаў. З гэтай мэтай творцы звяртаюцца і да прыёмаў графічнага мастацтва, выкарыстоўваючы ў арсенале сродкаў выразнасці контурныя лініі, штрыхі.

У цыкле «Іншыя светы» сучасны паўднёваафрыканскі мастак Са́рэл Тэ́ран стварае ілюзію новага Сусвету. У сваіх творах ён злучае, накладвае адзін на аднаго і апрацоўвае з дапамогай інструментаў камп'ютарнай графікі розныя вобразы. «Пераблытаўшы» мінулае і сучаснасць, рэальнае і фантастычнае, аўтар абуджае ўяўленне і фантазію гледача, заклікаючы паглядзець на звыклыя з'явы ў новым, нечаканым ракурсе.

***Камп'ютарная анімацыя.*** Укараненне камп'ютарных тэхналогій у кінематограф прывяло да нараджэння камп'ютарнай анімацыі. Гэта дазволіла плоскі малюнак зрабіць аб'ёмным, нерухомы — ажылым. У 1968 годзе ў СССР быў створаны мультфільм «Котачка» з першым анімаваным камп'ютарным персанажам. Камп'ютар мадэляваў рухі жывёлы і выводзіў



Кадр з анімацыйнага фільма «Котачка»
(рэжысёры Віктар Міна́хін, Мікалай Канстанці́наў)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Кадр з фільма
«Гісторыя цацак»
(рэжысёр Джон Лаcéтэр)

на прыстасаванне для друку. Асобныя кадры былі сабраны ў стужку.

Першы мультфільм, створаны пры дапамозе трохмернай камп'ютарнай графікі, — «Гісторыя цацак». У 1995 годзе ажылыя цацкі ў трохмернай выяве зрабілі на гледача незабыўнае ўражанне. 3D-мадэлі хутка сталі папулярнымі і пастулова выціснулі з анімацыі лялек.

Асаблівы прыём камп'ютарнай анімацыі выкарыстала ў фільме «Рыжык у Залюстроўі» беларускі рэжысёр Алена Турава. Анімаваны персанаж з'яўляецца побач з сапраўдным акцёрам і ўзаемадзейнічае з ім. Такі прыём узмацняе ў гледача адчуванне цуду і чараўніцтва.

Камп'ютарная анімацыя ў кінематографе не толькі спрашчае і паскарае творчы працэс. Яе магчымасці амаль бязмежныя. Камп'ютар дазваляе імітаваць любыя матэрыялы, стыль, тэхніку.



Кадр з фільма
«Рыжык у Залюстроўі»
(рэжысёр Алена Турава)



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Сёння прымяненне камп’ютарнай анімацыі дазваляе «ажывіць» не толькі герояў кіно, але і асобныя элементы афармлення кніг, рэкламы, старонак сацыяльных сетак у інтэрнэце і многае-многае іншае.

Камп’ютарная тэхніка няспынна ўдасканальваецца. І ў анімацыйных, і ў гульнявых фільмах мастакі сёння дасягаюць фатаграфічнай дакладнасці і рэалістычнасці. Магчыма, хутка з дапамогай камп’ютара можна будзе замяніць акцёраў-жывёл і акцёраў-людзей на віртуальных персанажаў.

***Сучасныя тэхналогіі ў кінематографе.*** У сучасным кіно папулярнай робіцца тэхналогія «захоп руху». У фільме «Авата́р» амерыканскага рэжысёра Джэ́ймса Кэ́мерана да адзення акцёра прымацоўваліся спецыяльныя датчыкі, якія фіксавалі яго міміку і рухі. Даныя з дапамогай тэхнікі «захопліваліся» і ўводзіліся ў трохмерную мадэль, якая імітавала рухі акцёра. Пасля складаных тэхнічных маніпуляцый мадэль пачынала рухацца…

Не менш папулярная і тэхналогія «аніматро́нік». Гэта мадэль чалавека або жывёлы, якую выкарыстоўваюць пры стварэнні складаных персанажаў. Напрыклад, у фільме «Парк Юрскага перыяду» рэжысёра Сты́вена Спі́лберга мадэль дыназаўра важыла амаль шэсць тон! Але ў фільме персанаж выглядае цалкам рэалістычна.

Не страцілі актуальнасці і *маляваныя выявы*, напрыклад дэкарацыі. Аднак калі ў 20 стагоддзі мастакі стваралі іх рукамі, то сёння




Сігу́рні Уі́вер
і Сэм Уо́ртынгтан
на здымках фільма
«Аватар»



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Кадр з фільма «Уладар пярсцёнкаў» (рэжысёр Пітэр Джэксан)

малююць альбо апрацоўваюць з дапамогай камп'ютара. Маляваныя дэкарацыі неабходныя тады, калі няма магчымасці зняць натуральныя. Дасягаючы фотарэалістычнасці выяў, мастакі ствараюць у кіно ілюзію навакольнага асяроддзя — гарадскіх і прыродных пейзажаў.

***Камп'ютарныя тэхналогіі ў музыцы.*** Наватарствам у сферы музычнага мастацтва стала *электронная* і *камп'ютарная музыка*. Французскі кампазітар Жан-Мішэль Жар пры стварэнні музычнага твора выкарыстаў электронныя інструменты і сінтэзатар. З дапамогай тэхнікі музыканту ўдалося стварыць сапраўдныя светлавыя шоу. Музычная партытура кампазіцыі «Оксіджэн» (Oxygene), узбагачаная колеравай вясёлкай, імітуе рух Зямлі і Космасу. Так камп'ютарныя



Жан-Мішэль Жар. Ігра на лазернай арфе



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

тэхналогіі атрымалі ўвасабленне адразу і ў гуку, і ў колеры, і ў асаблівай прасторы.

Камп'ютарныя тэхналогіі дапамаглі рэалізаваць тое, што раней цяжка было зрабіць намаганнямі толькі аднаго чалавека. Цяпер мастак можа ствараць, пакінуўшы машыне лічбы, схемы і формулы. Дзякуючы новым магчымасцям у мастацтве адкрылася прастора для новых тэм, вобразаў, фарбаў, тэмбраў і эфектаў.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Уважліва разгледзьце творы, створаныя з дапамогай камп'ютарнай графікі, прадстаўленыя ў параграфе. Які эмацыянальны водгук выклікаюць у вас гэтыя творы? Чаму ўсё часцей камп'ютарную графіку называюць «камп'ютарным жывапісам»?

2. Назавіце некалькі сучасных гульнявых фільмаў, у якіх спецэфекты вам падаліся асабліва цікавымі. Якога эфекту імкнуліся з іх дапамогай дасягнуць аўтары фільма? Паразважайце, якім быў бы фільм, калі б у ім не выкарыстоўваліся гэтыя спецэфекты.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

3. Выканайце эскіз анімацыйнага персанажа, вобраз якога вы ўжо прыдумалі раней (параграф 24) у даступным графічным рэдактары (Paint і інш.). Што ў вас атрымалася? Лёгка ці складана вам было працаваць над вобразам з дапамогай камп'ютара? Чаму?

## § 34. ТВОРЧЫ ЎРОК: МАСТАЦТВА І ТЭХНІКА

Камп'ютарныя праграмы і інструменты, з дапамогай якіх можна стварыць, зафіксаваць і паказаць мастацкі вобраз, развіваліся паступова.

Першы эксперымент па стварэнні вобраза з прымяненнем камп'ютарных тэхналогій правёў амерыканскі вучоны і мастак Бенджамі́н Лапо́скі. На прымітыўным камп'ютары ён атрымаў выяву светлавых фігур.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



**Бенджамін Лапоскі.**
Асцылон № 38

Сёння ў свеце музыкі існуе самая разнастайная спецыяльная апаратура. З дапамогай камп'ютарных праграм можна не толькі стварыць музычны твор, у якім будзе сабрана і змадэлявана гучанне розных інструментаў і галасоў, але і зрабіць яго бачным. Для правядзення канцэртаў класічнай і эстраднай музыкі з выкарыстаннем тэхнічных прыбораў і камп'ютарных праграм распрацоўваецца колерасветлавая партытура. Спецыяльная тэхніка дапамагае музыцы займець колер і форму.

Паслухайце ў інфармацыйных крыніцах кампазіцыю «Чароўны палёт» групы «Спэйс».

Раскажыце, якое ўражанне зрабіла на вас музыка. Якія выклікала асацыяцыі?

Паразважайце, які эфект быў дасягнуты кампазітарамі з дапамогай тэхнікі.

Пазнаёмцеся з любым даступным музычным канструктарам.

Выберыце для працы ў ім:
- музычны стыль;
- музычныя інструменты;
- тэмп;
- гучнасць.

Звярніце ўвагу на рытм, які адпавядае абранаму вамі стылю.
Запусціце праграму.

Паслухайце музыку, якая ў вас атрымалася.

Ці спадабалася вам ваша кампазіцыя?

Паспрабуйце яшчэ раз, але выберыце іншы стыль.

Паслухайце музыку, якую ў музычным канструктары стварылі вашы аднакласнікі.

Што вам спадабалася больш за ўсё?



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

# § 35. ТВОРЧЫ ПРАЕКТ

Сучасны свет шматгранны і часта непрадказальны. Штодня перад намі паўстае мноства розных пытанняў. Задумаўшыся над адказам, чалавек ступае на шлях творчасці. Кожны новы адказ — новая творчасць. Часам гэта адказ у слоўнай форме, часам — у выглядзе ліній і штрыхоў, у некаторых выпадках — гэта новая песня або відэазамалёўка... Чым больш пытанняў — тым больш творчых адказаў!

На апошніх уроках навучальнага года важна ўспомніць свае творчыя работы, расказаць пра іх у арыгінальнай форме аднакласнікам.

Можна стварыць новы праект на цікавую тэму. Магчыма, гэта будзе жывапісная або графічная работа; можа, вы паспрабуеце інсцэніраваць невялікую казку, байку або апавяданне, падрыхтуеце арыгінальную фотазамалёўку пра жыццё класа... Кожны з вас можа сканцэнтраваць увагу на тым відзе мастацкай творчасці, які падабаецца.

А можна прысвяціць апошнія ўрокі яшчэ адной сустрэчы з творамі мастацтва, якія вам асабліва запомніліся. Вы пазнаёміліся з дзіўнымі героямі тэатральных пастановак, кінафільмаў, разважалі разам з імі пра іх пачуцці, учынкі, узаемаадносіны. І, вядома ж, пра тое, як пачуцці і ўчынкі герояў увасоблены ў творах мастацтва.



Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

______________________________________________________________

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Захарына** Юлія Юр'еўна
**Колбышава** Святлана Іванаўна
**Валанцэвіч** Наталля Сяргееўна і інш.

**МАСТАЦТВА**
**(айчынная і сусветная мастацкая культура)**

Вучэбны дапаможнік для 6 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання
(з электронным дадаткам)

*2-е выданне, перагледжанае*

Рэдактары *А. У. Бельская, А. В. Міронава*
Дызайн *К. У. Максімава*
Мастацкія рэдактары *К. У. Максімава, К. К. Шастоўскі*
Мастак вокладкі *К. У. Максімава*
Праўка камп'ютарнага набору *А. У. Бельская, В. Ю. Лагун*
Камп'ютарная вёрстка *В. Ю. Лагун*
Карэктар *А. У. Бельская*

*У мастацкім афармленні выдання выкарыстаны ілюстрацыі з wikimedia.org, shutterstock.com і іншых крыніц, а таксама тэксты мастацкіх твораў (поўны пералік у электронным дадатку).*

Падпісана да друку 15.03.2023. Фармат 70 × 100 1/16. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 9,75. Ул.-выд. арк. 6,2 + 3,5 эл. дад. Тыраж 13 070 экз. Заказ .

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/19 ад 02.08.2013.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 10.09.2018.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.


Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»